ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дарожным дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Паскрод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьніж тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. задаку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЬ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Пачны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПАНЯДЗЕЛАК, 21 ліпеня 1930 г.
№ 168 (3766)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Выканаць баявыя пляны будаўніцтва фабрык мяса

Бязьлітасная вайна самацёку і бюракратычнаму ігнараваньню сьвінагадоўлі

Забясьпечыць бесьперабойнае ўкамплектаваньне сьвінаводных калгасаў і саўгасаў, скончыць у тэрмін будаўніцтва сьвінарнікаў, падрыхтаваць кадры, падвесьці пад сьвінагадоўлю моцную кармавую базу

Ударная задача

Упарта змагацца за вырашэньне мясной праблемы, за разьвіцьцё сьвінагадоўлі

Усім акругкомам і райкомам КП(б)Б, усім рэдакцыям газэт, НКЗ, фракцыі Калгасцэнтру, фракцыі трэсту „Сьвінавод"

Ня гледзячы на вялікае гаспадарча-палітычнае значэньне разьвіцьця сьвінагадоўлі ў агульнай сыстэме мерапрыемстваў па вырашэньні мясной праблемы, ЦК КП(б)Б адзначае, што на справу разьвіцьця сьвінагадоўлі да гэтага часу ко зварочваюць патрэбнай увагі і ўся падрыхтоўчая работа не пастаўлена так, каб цалкам забясьпечыць выкананьне гэтай важнейшай баявой задачы ў бліжэйшы пэрыяд.

Прайшло больш, як 3 месяцы з часу выданьня пастаноў аб разьвіцьці сьвінагадоўлі. А між тым работа ў спэцыялізаваных сьвінагадоўчых саўгасах і калгасах не разгорнута. Амаль што нічога ня робіцца па ўкамплектаваньні матачным матар'ялам і па стварэньні кармавой базы. Не ва ўсіх саўгасах і калгасах пачата будаўніцтва і зусім ня прыцягнута грамадзкасьць бядняцка-сярэдняцкіх мас вёскі і нават саміх рабочых саўгасаў і калгасьнікаў вакол мерапрыемстваў па разьвіцьці сьвінагадоўлі.

У некаторых акругах і раёнах да гэтага часу канчаткова ня вызначаны сьвінагадоўчыя калгасы, а ў вызначаных па некалькі разоў мяняўся кірунак іх гаспадарчай дзейнасьці, што заблытвала калгасьнікаў і затрымлівала пачатак работы ў гэтых калгасах.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб гэтым насьці патрэбнай увагі і кіраўніцтва з боку АК і РК КП(б)Б мерапрыемствамі па разьвіцьці сьвінагадоўлі. ЦК КП(б)Б лічыць такое зьявішча зусім недапусьцімым і пагражаючым зрывам плянавых заданьняў. Акругкомы і райкомы павінны дабіцца такіх тэмпаў у разгортваньні сьвінагадоўлі, каб яны забясьпечвалі да канца 1930-31 г. таварны выхад сьвіней — у саўгасах — 250 тысяч галоў і ў калгасах — 500 тысяч галоў.

Практычная работа па арганізацыі сьвінагадоўчых калгасаў і саўгасаў павінна зьяўляцца першачарговай задачай партыйных арганізацый. Вакол гэтых мерапрыемстваў трэба стварыць шырокую грамадзкасьць і абавязкова забясьпечыць выкананьне наступных мерапрыемстваў:

1. Забясьпечыць кіраўніцтва работаю адпаведных савецкіх устаноў і калгаснаапэрацыйнай сыстэмы з тым, каб поўнасьцю і бясспрэчна выканаць кантрольныя лічбы па сьвінагадоўлі. У першую чаргу павінны быць разгорнуты і ўкамплектаваны сьвінаматкамі спэцыялізаваныя сьвінаводчыя саўгасы. Сур'ёзная ўвага павінна быць звернута на барацьбу з фармальнымі адносінамі да гэтай справы, непатрэбнымі і шкоднымі спрэчкамі з прыцягненьнем вінаватых у зрыве намечаны мерапрыемстваў да строгай партыйнай і судовай адказнасьці.

2. ЦК КП(б)Б абавязвае канчаткова і не позьней, як у дэкадны тэрмін, вылучыць сьвінагадоўчыя калгасы з поўнай дастаўкай у іх намечаных пляном сьвіноматак. Пры вызначэньні гэтых гаспадарак трэба спачатку правесьці растлумачальную работу сярод калгасьнікаў аб карысьці гэтых мерапрыемстваў для калгасаў і важнасьці для дзяржавы.

У зьвязку з тым, што ў гэтым пытаньні ёсьць шмат непаразуменьняў сярод калгасьнікаў, вылучаныя гаспадаркі павінны спэцыялізавацца толькі ў адным кірунку. Патрэбна весьці рашучую барацьбу з імкненьнямі да універсалізму ў калгасах, што ня можа забясьпечыць стварэньня таварнай гаспадаркі.

Таксама трэба катэгарычна забараніць у вызначаных да сьвінагадоўлі калгасах рабіць зьмены ў іншы бок іх спэцыялізацыі.

3. Партыйныя і камсамольскія вясковыя ячэйкі павінны на чарговых сходах паставіць спэцыяльна пытаньне аб практычным выкананьні мерапрыемстваў, намечаных па разьвіцьці сьвінагадоўлі. Трэба дапамагчы саўгасам і калгасам у практычнай іх рабоце па кампляктаваньні сьвінаматачным матар'ялам, па будаўніцтве сьвінарнікаў, сілосных ям і вежаў і дапаможных будынкаў.

4. Разам з намечанымі мерапрыемствамі партарганізацыі павінны зьвярнуць увагу на арганізацыю сьвінагадоўчых гаспадарак у больш моцных малочнажывёлагадоўчых таварыствах, шляхам пабудовы новых і прыстасаваньня адпаведных памяшканьняў для сьвінарнікаў і камплектаваньня сьвінаматачным матар'ялам.

5. Зараз-жа трэба ва ўсіх сьвінагадоўчых саўгасах і калгасах пачаць будаўніцтва сьвінарнікаў для сьвінаматак, сілосаў і дапаможных будынкаў. У першую чаргу павінна быць звернута ўвага на пабудову матачнікаў, ізалятараў і карантынаў, пры гэтым трэба скарыстоўваць таксама старыя будынкі. Рашуча весьці барацьбу за поўнае скарыстаньне ўсіх матар'яльных магчымасьцяй пры пабудове і асабліва за замену дэфіцытных будаўнічых матар'ялаў — мясцовымі. У адносінах да дэфіцытных матар'ялаў (цьвікі, цэмент, жалеза) трэба праявіць асаблівую эканомію, выдаткоўваючы іх толькі тады, калі іх зусім нельга замяніць мясцовымі матар'ялямі. Пры будаўніцтве памяшканьняў і куплі сьвіней трэба выкарыстоўваць сродкі і саміх калгасьнікаў.

6. ЦК КП(б)Б з усёй катэгарычнасьцю адзначае, што з-пад увагі ўсіх арганізацый (Наркамзем, каапэрацыя) у справе разгортваньня работы па разьвіцьці сьвінагадоўлі выпаў важнейшы вучастак гэтай работы — бядняцка-сярэдняцкі індывідуальны сэктар сельскай гаспадаркі. Такое становішча ні ў якім разе не дапусьціма. Органы Наркамзему, каапэрацыі і ўсе партыйчэйкі на мясцох павінны забясьпечыць адпаведнае разгортваньне работы сярод індывідуальных бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак з тым, каб забясьпечыць разьвіцьцё сьвінагадоўлі у індывідуальных гаспадарках. Разам з вылучанымі спэцыялізаванымі калгасамі трэба дабіцца шырокага разгортваньня сьвінагадоўлі ў астатніх калгасах.

7. ЦК КП(б)Б зварочвае асаблівую ўвагу на пагражаючае становішча з кантрактацыяй сьвіней для кампляктаваньня статкаў саўгасаў і калгасаў. Трэба каб усе партыйныя камітэты і ячэйкі з асаблівай напружанасьцю прынялі ўсе меры да поўнага выкананьня плянаў па кантрактацыі. Ад таго, як будзе праведзена кантрактацыя, залежыць выкананьне плянаў па сьвінагадоўлі ў саўгасах і калгасах.

8. Адначасова з кантрактацыяй трэба разгарнуць куплю сьвінаматак і пэрасят у індывідуальных гаспадарках і ў калгасьнікаў для поўнага кампляктаваньня сьвінаматачным матар'ялам саўгасаў і калгасаў.

ЦК катэгарычна зварочвае ўвагу НКЗ, «Сьвінаводу» і Белкалгасцэнтру на тое, што трэба сваячасова і рашуча змагацца з эпізоотыяй сьвіней, у першую чаргу поўнасьцю ўкамплектоўваючы вэтпэрсаналам сьвінаводчыя саўгасы і калгасы.

10. Камсамольская арганізацыя па прыкладу выкананьня важнейшых гаспадарчых задач у мінулым (паход за ўраджай, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва) можа і павінна разгарнуць шырокую работу па разьвіцьці сьвінагадоўлі. ЦК КП(б)Б канстатуе, што да гэтага часу няма хаця крыху прыкметнай работы камсамолу па актыўным ўдзеле ў разьвіцьці сьвінагадоўлі.

ЦК КП(б)Б абавязвае камсамол разгарнуць шырокую работу па ўдзелу ў лепшым вырашэньні задач сьвінагадоўлі. Разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва паміж камсамольскімі ячэйкамі, арганізаваць маладзёжныя ўдарныя брыгады і забясьпечыць камплектаваньне курсаў патрэбнымі кадрамі — вось формы, праз якія можна дасягнуць добрых вынікаў.

11. ЦК КП(б)Б напамінае, што замацаваньне ўсіх мерапрыемстваў па сьвінагадоўлі будзе забясьпечана толькі пры умове поўнага вырашэньня ў калгасах кармавога пытаньня. Пры правядзеньні практычнай работы трэба ў першую чаргу зьвярнуць увагу на сваячасовую пабудову сілосных установак, поўнасьцю забясьпечыць сьвіное стада калгасаў кармамі. Трэба прадугледзець у плянах калгасаў севазавароты кармоў па азімых культурах і ў будучую вясеньнюю пасяўную кампанію.

12. Ажыцьцяўленьне практычных задач у разьвіцьці сьвінагадоўлі можа быць пасьпяхова праведзена пры ўмове шырокага разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва паміж саўгасамі і калгасамі, пры ўмове шырокага разьвіцьця ўдарніцкага руху. Парт'ячэйкі і мабілізаваныя таварышы на ўборачную кампанію павінны дапамагчы калгасам і саўгасам наладзіць разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

13. Напамінаючы аб важнасьці і сур'ёзнасьці задач, што пастаўлены ў справе разгортваньня сьвінагадоўлі, ЦК КП(б)Б прапануе: цэнтральнаму і акруговаму друку наладзіць сыстэматычную барацьбу за поўнае выкананьне заданьняў партыі і ўраду. Задача друку: з усёй сілай біць на слабых вучастках работы, падцягваць тых, хто адстае, разгортваць соц. спаборніцтва, рашуча выкрываць тых, хто перашкаджае разгортваньню работы па сьвінагадоўлі, падпарадкаваць шырокай самакрытыцы ўсю работу па выкананьні гэтых важнейшых задач.

САКРАТАР ЦК КП(б)Б
ВАСІЛЕВІЧ.

Сьвіньні і бюракраты

Камарынскі раён павінен да 1 кастрычніка 1930 г. паставіць на адкорм 800 сьвінаматак. Баявое заданьне патрабуе баявых тэмпаў работы. Раённыя арганізацыі павінны былі безадкладна правесьці спэцыялізацыю калгасаў, разгарнуць укамплектаваньне сьвінаводных калгасаў сьвінаматачным матар'ялам і прыступіць да будаўніцтва сьвінарнікаў. Трэба было распрацаваць дакладныя пляны будаўніцтва ў сьвінаводных калгасах, забясьпечыць калгасы будаўнічым матар'ялам, падрыхтаваць кадры і г. д.

Ці робіцца гэта ў раёне? Ці выконваюць мясцовыя арганізацыі заданьне па пастаўцы сьвінаматак? Не. Далей бюракратычных разважаньняў, далей бяссэнсоўных ведамсьцьвеных спрэчак справа не пайшла. Бюракратызм, бесплянавасьць і безадказнасьць з боку некаторых раённых і акруговых арганізацый патражаюць сарваць сьвінагадоўлю ў раёне. Пяройдзем да фактаў.

Вылучэньне калгасаў пад сьвінаводныя гаспадаркі было праведзена зусім дрэнна. Спачатку вылучылі 6 сьвінаводных калгасаў. Потым спалохаліся і зьменшылі колькасьць калгасаў на 50 проц. У раёне засталіся толькі 3 сьвінаводныя калгасы, якія атрымалі крэдыты на суму ў 23.000 руб. Паводле афіцыйных даных для калгасаў ужо адпушчан будаўнічы матар'ял з лесу.

Але будаўніцтва ў раёне яшчэ зусім не разгорнута. Калгасьнікі мяркуюць прыступіць да будаўніцтва толькі пасьля ўборачнай кампаніі.

— Няма куды сьпяшацца, — заяўляюць калгасьнікі, з будаўніцтвам сьвінарнікаў усёроўна спозьнімся.

На жаль, гэтыя дэмабілізацыйныя настроі маюць пад сабою ўсе падставы. Замест практычнай работы адпаведныя раённыя і акруговыя арганізацыі доўгі час спрачаліся паміж сабой, хто што павінен рабіць і хто за што адказвае. Раённы выканком, аддзяленьне Лесбеду і акруговая інспэкцыя лясоў цэлыя тыдні вялі паміж сабою службовыя перагаворы наконт водпуску лесу сьвінаводным калгасам. Пакуль бюракраты, якія сядзяць у гэтых установах спрачаліся паміж сабою, калгасы, зразумела, ня мелі ніякай магчымасьці прыступіць да будаўніцтва. Нарэшце, Лесбед зьлітаваўся і дазволіў адпусьціць калгасам лес з пэўных вучасткаў.

Не пасьпелі калгасьнікі паехаць у лес, як высьветлілася, што ўсе гэтыя вучасткі даўно ўжо дашчэнту высячаны. Зноў пачаліся ведамсьцьвеныя перагаворы і спрэчкі.

Вырашаючы пытаньне аб водпуску лесу, раённыя работнікі зусім забылі, што трэба яшчэ складаць каштарысы будаўніцтва, пляны будоўлі, падрыхтаваць рабочую сілу і г. д. У гэтым напрамку ў раёне літаральна нічога ня робіцца.

Зараз калгасьнікі, нарэшце, атрымаўшы дазвол, высяклі вызначаны вучастак лесу. Але лес і па сёньняшні дзень ня вывезен. Якія-ж меры ўжывае раённы калгассаюз? Нядаўна калгассаюз разаслаў па калгасах суровую паперку: будуйце сьвінарнікі ва што-б там ні стала, у працёўным выпадку пойдзеце пад суд.

Аднак, гэтая паперка сваёй мэты не дасягнула. Калгасьнікі, не атрымаўшы ніякай дапамогі і практычных паказаньняў, нічога ня будуюць.

— Лес высяклі, — гавораць калгасьнікі, а што далей рабіць ня ведаем.

З боку раённых арганізацый няма ніякага кіраўніцтва па ўсіх пытаньнях, зьвязаных з сьвінагадоўляй. Райкалгассаюз, як мы адзначалі вышэй, замест канкрэтнай дапамогі і інструктажу займаецца толькі тым, што пагражае «аддаць усіх пад суд». У райвыканкоме мяркуюць, што «кіраўніцтва сьвінагадоўлай наладзіць можна будзе і пасьля, калі будуць сьвінарнікі і сьвіньні».

Відавочна, што і райвыканком і райкалгассаюз узялі стаўку на самацёк. Калгассаюз нават ня ведае, што робіцца ў сьвінаводных калгасах. Напрыклад, саюз упэўнен, што ў калгасе «Чырвоны Будаўнік» ёсьць ужо звыш 30 сьвінаматак. У сапраўднасьці-ж калгас мае ўсіх сьвіней менш 10 штук. Усе калгасы ня ведаюць, дзе набываць сьвінаматак. З вялікім напружаньнем калгасы так-сяк набылі кадзь 50 сьвінаматак. Пакуль што на гэтым пастаўлена кропка.

Няўжо-ж ніхто не перашкодзіць камарынскім бюракратам сарваць сьвінагадоўлю ў раёне?

Н.

М. Камарын.
Гомельшчына.

Так нельга працаваць

Былыя саўгасы Вежсельтрэсту — «Некрашы», «Бранчыцы» і «Івань» перададзены Сьвінаводтрэсту. Для будаўніцтва і ўкамплектаваньня гэтых гаспадарак адпушчана каля 250.000 рублёў крэдыту.

У якім-жа становішчы знаходзіцца будаўніцтва ў гэтых саўгасах. Трэба проста сказаць, што будаўніцтва ў саўгасах зрываецца. Саўгас «Бранчыцы» поўнасьцю забясьпечаны будаўнічым матар'ялам. Ня гледзячы на гэта, ён зусім яшчэ ня прыступіў да будаўніцтва. Між тым, у саўгасе трэба, паводле пляну ў бліжэйшы час скончыць пабудову 2-х матачнікаў на 96 сьвінаматак кожны, 2 адкормачныя пункты на 30 штук кожны, інтэрнат для рабочых, сталоўку, ізалятар і г. д. Ад саўгасу «Пагост» саўгас «Бранчыцы» атрымаў 192 штукі сьвіней, з якіх 60 зьяўляюцца племянымі. Усе гэтыя сьвіньні зараз марнеюць у загародніках з-за адсутнасьці сьвінарнікаў. Сярод сьвіней пайшла хвароба. Ёсьць небясьпека, што ўсе сьвіньні загінуць.

Больш-менш добра стаіць справа з будаўніцтвам ў саўгасах «Івань» і «Некрашы». Саўгас «Івань» пабудаваў матачнік на 96 сьвінаматак. Саўгас «Некрашы» прыступіў да будаўніцтва адкормачнага пункту на 150 сьвіней. У саўгасе канчаецца будаўніцтва інтэрнату і сталоўкі для рабочых і будуецца матачнік на 96 сьвіней. Аднак, і такое становішча нас ні ў якой мере не задавальняе. І саўгас «Івань» і саўгас «Некрашы», ня гледзячы на пэўныя посьпехі ў будаўніцтве, яшчэ ў значнай ступені ня выканалі будаўнічых плянаў.

Загадчыкі саўгасаў апраўдваюць зусім невыстарчальныя тэмпы будаўніцтва вылучна «аб'ектыўнымі» прычынамі. Заг...

Уборка сенажаці на Меншчыне

Бяспрытульны вучастак

Наладзіць грамадзкае харчаваньне ў саўгасах
Белкаапсаюз ігнаруе вижнейшую справу

Грамадзкае харчаваньне ў саўгасах Сьвінтрэсту пастаўлена злачынна. Уборачная кампанія і будаўніцтва сьвінарнікаў у большасьці саўгасаў зрываюцца толькі таму, што ў саўгасах зусім не наладжана грамадзкае харчаваньне. Рабочыя кідаюць работу і ходзяць па вёсках, шукаючы чагонебудзь купіць для сьнеданьня. У радзе саўгасаў **Меншчыны** рабочыя ў часе работы ствараюць сваяасаблівыя брыгады, якія вандруюць па вёсках у пошуках харчовых прадуктаў. Пільнічыкі ў саўгасе **«Лагоза»** (Лагойскі раён, Меншчына) кожны дзень прад'яўляюць ультыматум кіраўніку саўгасу: калі ня будзе наладжана харчаваньне, дык мы кінем работу. Між тым, у саўгасе будуюцца 4 вялікія сьвінарнікі. У саўгасе **«Луцэўшчына»** сэзонныя рабочыя і цесьляры кідаюць работу, бо ў саўгасе і ваколічных вёсках нельга нават здабыць харчовых прадуктаў, а ў самым саўгасе грамадзкае харчаваньне зусім не наладжана.

Мы стаім перад рэальнай пагрозай зрыву будаўніцтва сьвінарнікаў і сьвінаводных саўгасаў, бо рабочыя ня хочуць ісьці туды на работу, гаворачы, што ў саўгасах «няма ніякай магчымасьці харчавацца».

Спажывецкая каапэрацыя нічога не зрабіла, каб наладзіць грамадзкае харчаваньне ў сьвінаводных саўгасах. Дагавор, заключаны паміж Сьвінаводтрэстам і Цэнтрасаюзам па забесьпячэньні саўгасных рабочых прадуктамі спажываньня зрываецца. Белкаапсаюз ня сочыць за выкананьнем гэтага дагавору.

Мы падкрэсьліваем, што адсутнасьць грамадзкага харчаваньня ў сьвінаводных саўгасах ставіць пад пагрозу пляны будаўніцтва сьвінарнікаў і стварае напружанае становішча з рабочай сілай у саўгасах. Калі ня будуць прыняты неадкладныя меры з боку каапэрацыйных арганізацый, дык вынікі аказ...

Ш—і.

Блытаніна

Чаго чакаюць Белмалжывсаюз і Белдзяржгандаль

Наркамзем БССР і Наркамгандаль далі выразныя дырэктывы якім арганізацыям трэба здаваць закантрактаваны сьвінаматачны матар'ял. Але за дырэктывамі не пасьледвала практычная работа. Белмалжывсаюз і Белдзяржгандаль да гэтага часу ня далі ніякіх канкрэтных практычных паказаньняў сваім акруговым аддзяленьням. Акруговыя аддзяленьні, ня ведаючы, што трэба рабіць у пытаньнях здачы закантрактаванага сьвінаматачнага матар'ялу, з свайго боку не праяўляюць ніякай ініцыятывы. Яны чакаюць пакуль прачнуцца Белмалжывсаюз і Белдзяржгандаль.

У здачы сьвінаматачнага матар'ялу з адкормачных пунктаў ЦРК і Белкаапсаюзу таксама панус хаос. Акругі кожны дзень атрымоўваюць усё новыя і новыя дырэктывы. Сёньня прапануюць здаць поўную колькасьць сьвінаматак, заўтра катэгарычна прапануюць зусім устрымацца ад здачы і г. д.

Калі-ж скончыцца гэта недапушчальная блытаніна. Белмалжывсаюз, Белдзяржгандаль, Белкаапсаюз павінны ведаць, што яна зрывае сьвінагадоўлю.

Г.

Правал пан-Эўропы

ПАХАВАНЬНЕ ЧАРГОВАГА „МІРАТВОРЧАГА" ПРАЕКТУ

ПАРЫЖ, 19. Францускі буржуазны друк, за выключэньнем «левага», які накуль што ўстрымліваецца ад камэнтараў, ацэньвае ангельскі адказ, як **фактычнае адмаўленьне ад пан-эўрапейскага праекту.** Асноўнымі матывамі ангельскай «стрыманасьці» друк лічыць: 1) апасеньне канфлікту з Злучанымі Штатамі, 2) нясумяшчальнасьць ідэі фэдэрацыі з імкненьнем Англіі ўстанавіць імпэрскія пратэкцыяністкія мытныя барэры, 3) апасеньне, што фэдэрацыя нанясе страту «Ліге Нацый», на становішча ў якой Англіі скардзіцца няма чаго. Падагульваючы вынікі водгукам дзяржаў на брыянаўскую ініцыятыву, друк характарызуе іх, як **вельмі пэсымістычныя.**

Пэртынакс у **«Эко дэ-пары»** піша: «Чаму трэба меркаваць, што эўрапейскія праблемы будуць лепш вырашаны ў рамках эўрапейскай фэдэрацыі, чым у Ліге Нацый? **Калі работа Лігі Нацый з кожным днём робіцца ўсё менш карыснай, дык дзе-ж довады, што тыя-ж, людзі, перайшоўшы ў склад рады эўрапейскай фэдэрацыі, лепш справяцца са справай?** Адзіным апраўданьнем пан-Эўропы можа быць толькі **імкненьне арганізаваць абарону супроць Амэрыкі і Азіі».**

«Фігаро» піша: «Адказ Нямеччыны даў нам адчуць небясьпеку, якая існуе ў Эўропе. Ангельскі адказ сьведчыць аб тым, што мытныя ўзброеньні зусім не падрыхтоўваюць міру».

«Ордр» заяўляе, што брыянаўскі праект стварыў у Эўропе небясьпечны **канфлікт. «З аднаго боку,—піша газэта, —пераможаныя краі патрабуюць перагляду дагавораў.** З другога—саюзныя з Францыяй дзяржавы супроць гэтага перагляду, а трэцяга—нэйтральныя дзяржавы чакаюць будучых перагавораў».

АНГЛІЯ НЯ СПЫНЯЕ БУДАЎНІЦТВА ВАЕННАГА ФЛЕТУ

ЛОНДАН, 17. Макданальд, адказваючы на запытаньне ў палаце вобшчын, заявіў, што згода паміж Францыяй і Італіяй аб часовым спыненьні морскага будаўніцтва **не датычыць Англіі** і няма патрэбы, каб ангельскі ўрад ухваляў якія-небудзь меры адносна яе морскай праграмы на 1930 год.

ЮГАСЛАВІЯ РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЙНЫ

Ствараецца спэцыяльная рада абароны, у склад якой ўваходзіць **вайсковы міністар і начальнік штабу.**

Задачамі рады па абароне краю на падставе генэральнага мабілізацыйнага пляну, **зьяўляюцца: мілітарызацыя транспарту, прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і фінансаў, а таксама падрыхтоўка моладзі да вайны.**

ВЯЛІКІЯ МАНЭЎРЫ РУМЫНСКАЙ АРМІІ

ВЕНА, 18. У ваколіцах Пішэшта адбываюцца вялікія **манэўры румынскай арміі** пад кіраўніцтвам вайсковага міністра Чыхоскага.

У манэўрах прымаюць удзел на аднэй дывізіі ад кожнага корпусу. Чакаецца прыезд афіцэраў пасьляваенных кантынгентаў.

МОРСКІЯ ЎЗБРАЕНЬНІ ГРЭЦЫІ

Грэцкі ўрад заказаў у Італі **два новых зьнішчыцелі** па 1.400 тон вадазьмяшчэньнем у дадатак да двух, якія ўжо будуюцца.

Кожны зьнішчыцель будзе каштаваць 253.000 ангельскіх фунтаў. Зьнішчыцелі будуць узброены 4 гарматамі па 120 м.м. і 6 мінамётамі па 53 с-м.

Ваенныя падрыхтоўкі Чэха-Славакіі

ПРАГА, 17. Яшчэ ў часе канфэрэнцыі Малай Антанты чэхаславацкі вайсковы міністар, які прысутнічаў у Белградзе на ўсеславянскім ваенна-сакольскім зьлёце адкрыта сказаў: «сакольскі зьезд, які цяпер адбываецца ў Белградзе, набывае тым большае значэньне, што ён праходзіць адначасова з канфэрэнцыяй Малай Антанты ў Штрбскім Плесе... Мы павінны глядзець у вочы самым цяжкім магчымасьцям, калі кожнай з саюзных дзяжаў прыдасцца абараняць ня толькі свае асабістыя інтарэсы, але і агульныя інтарэсы ўсіх саюзных краёў. Хоць мы не маем аніякіх агрэсыўных намераў, аднак мы павінны быць заўсёды на пагатове»

Сярод фактаў першачарговай важнасьці, якія паказваюць на ўзмацненьне тэмпу падрыхтоўкі да вайны ў краёх Малай Антанты — у прыватнасьці ў Чэха-Славакіі, асабліва значэньне набывае прыезд некалькі дзён таму назад у Чэха-Славакію **францускага генэрала Мітэльгаўэзра, вядомага прапетарыяту Сярэдняй Эўропы па яго ролі ў задушэньні Вэнгэрскай Савецкай Рэспублікі ў 1919 годзе.**

Як паведамляе «Рудэ Права», у цеснай сувязі з візітам генэрала Мітэльгаўэзра знаходзяцца даволі нязвычайныя экскурсіі **вышэйшых афіцэраў Чэха-Славакіі, Румыніі, Югаславіі і Францыі** ў раён Штром і Смакоўца. Газэта сьцьвярджае, што гэтымі днямі там адбыліся важныя ваенныя нарады. Назначаныя на канец ліпеня і пачатак жніўня армейскія манэўры (у Славакіі і Маравіі) пройдуць па больш шырокай праграме, чым гэта меркавалася яшчэ месяц таму назад.

(ТАСС).

Правакацыя латвійскіх фашыстых

РЫГА, 20. Два гады таму назад у **Літванах былі арыштаваны два цесьляры,** якія сплаўлялі савецкі лес па Дзьвіне. Сплаўшчыкаў абвясьцілі «агентамі Камінтэрну».

Гэтымі днямі ў **Якобштадзе арыштаваны тры савецкіх сплаўшчыкі—Нічас, Конышаў і Гайлаў.** Паводле слоў правых газэт, арыштаваныя «адкрыта лаявых газэт, арыштаваныя «адкрыта лаявых газэт, і ўвялі савецкі лад». Паводле пагражае зьняволеньнем на 3 гады. У апошнія тры тыдні савецкія сплаўшчыкіс ыстэматычна правакуюцца нейкімі цёмнымі асобамі, якія дабіваюцца відавочна **зрыву работы па сплаве савецкага лесу.**

«Сацыял-Дэмакрат» выступіў з рэзкім артыкулам супроць арышту, якія «выклікаюць сур'ёзныя ўскладненьні ў чыста гаспадарчых справах і накіраваны

Пачаліся хлебазагатоўкі на Кубані, у Крыме і Украіне

Чырвоныя абозы

ЧЫРВОНЫ АБОЗ У 300 ЦЭНТ. ПШАНІЦЫ

Калгас «Чырвоны Кастрычнік» (Сафіеўскага раёну) зараз-жа пасьля абмаловання адправіў на элеватар чырвоны абоз у 300 цэнт. пшаніцы. Калгас выклікае на сацспаборніцтва ўсе калгасы акругі.

НОВЫ ХЛЕБ—У ФОНД КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Сафіеўская камуна ім. Чубара (Кахаўскага раёну) здала ў фонд калектывізацыі сельскае гаспадарчі першую партыю хлеба новага ўраджаю.

10 ЦЭНТН.—У ФОНД ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Калгасы Салдаціцкага сельсавету (Крыварокскае акругі) пастанавілі здаць у фонд індустрыялізацыі краю 10 цэнтн. пшаніцы са зьнятага ўраджаю.

УВЕСЬ ХЛЕБ ЗДАЦЬ СВАЯЧАСОВА

Сельскагаспадарчая арцель «Чырвоны Луг» (Васількаўскага раёну) прывезла на элеватар Саюзхлеба 20 тон абожжа новага ўраджаю. На элеватары адбыўся мітынг, на якім калгасьнікі пакляліся сваячасова здаць увесь хлеб.

РАБОЧЫЯ ДАПАМАГЛІ ЗДАЦЬ УРАДЖАЙ З 800 ГЭКТ.

200 рабочых Крыварожжа, якія знаходзяцца ў доме адпачынку пры саўгасе «Чырвоны Маяк», арганізавала выйшлі на дапамогу калгасам па ўборцы ўраджаю. За 6 гадзін рабочыя зьнялі ўраджай з 800 гэкт. зямлі. Дапамога рабочых выклікала вялізарны ўздым сярод калгасьнікаў.

ПЕРШАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ—40 ТОН ЖЫТА І ПШАНІЦЫ

Скелюванская сельскагаспадарчая арцель у Запарожжы здала першую пар-

Напярэдадні 1-га жніўня

Сялянскія масы Эўропы рыхтуюцца да выступленьняў

«ПАГРАНІЧНАЯ СУСТРЭЧА» СЯЛЯН

БЭРЛІН, 18. Эўрапэйскі сялянскі камітэт мабілізуе сялянскія масы Эўропы да выступленьняў 1-га жніўня. У адозьве да сялян камітэт нагадвае, што працоўнае сялянства ўсёй Эўропы ў цесным саюзе з рабочай клясай павінна дэманстраваць 1-га жніўня супроць імпэрыялістычнай вайны.

Сялянскія камітэты ў розных краёх ужо пачалі падрыхтоўку да 1-га жніўня. Галяндзкі камітэт арганізуе «пагранічную сустрэчу» галяндзкіх, нямецкіх і бэльгійскіх сялян у часе дэманстрацыі супроць вайны. **У Аўстрыі** наладжваецца антываенны сялянскі зьлёт. **Польскі** камітэт арганізуе сход сялян і арганізуе збор у антываенны фонд.

Заклік брацкіх кампартый

БЭРЛІН, 20. Кампартыі **Швэйцарыі, Аўстрыі, Эльзас-Лётарынгіі** і абласныя камітэты нямецкай кампартыі **Бадэна, Вюртэмбэрга, Пфальца, Баварыі,** а таксама камсамольская арганізацыі гэтых краёў і рад пралетарскіх масавых арганізацый зьвярнуліся да ўсіх рабочых ваенных прадпрыемстваў з закліком прыняць удзел у міжнародным ан-

Адзіны шлях зьнішчэньня беспрацоўя мільёнаў—

Гэта—зьвяржэньне разбойніцкай сыстэмы капіталістычнай эксплёатацыі і ўстанаўленьня ўлады рабочых і сялян

БЭРЛІН, 20. У сувязі з роспускам рэйхстагу, ЦК нямецкай кампартыі зьвярнуўся да рабочых, работніц, служачых і працоўных сялян Нямеччыны з маніфэстам, у якім зазначае, што ўрад «Сталёвага Шлему», хрысьціянскіх праф бюракратаў, цэнтру, буйных прамыслоўцаў і памешчыкаў разагнаў рэйхстаг, каб без перашкод праводзіць рэжым дыктатуры.

Урад буржуазіі,—гаворыцца далей у адозве,—адмаўляецца нават ад «дэмакратычнага» фасаду, парушае сваю ўласную канстытуцыю, скідае тогу «законнасьці». Устанаўленьне панаваньня дыктатарскага параграфу 48 і роспуск рэйхстагу зьяўляюцца рашучымі крокамі на шляху да фашысцкай дыктатуры фінансавага капіталу Нямеччыны.

Закранаючы ролю сацыял-дэмакратычных партый, рэфармісцкіх прафбюракратаў адозва гаворыць.

Няма ніводнага прадвыбарчага абяцаньня, якога-б сацыял-дэмакраты не ца, падтрымлівала грабёж зарплата праграмы буржуазіі, якой сацыял-дэмакраты не падтрымалі-б, ні адзін акт фашысцкага тэрору, ні расстрэл 33 першамайскіх дэманстрантаў, ні забарона саюзу чырвоных франтавікоў, ні выданьне закону аб ахове рэспублікі не абышоўся без антыўнага ўдзелу палітцайскіх сацыялістых, якія шчыра вы-

тыя галасавала за пабудову бранянос-ца, падтрымлівала грабёж зарплаты пра-петараў Мансфэльду і Паўночна-Заходняга раёну. Цяпер сацыял-дэмакраты па кіўку руки Гіндэнбурга скасавалі забарону фашысцкага «Сталёвага Шлему».

Кампартыя паказвае, што адзіны шлях выходу са створанага плянам Юнга крызісу, фінансавай гапечы, доўгага беспрацоўя мільёнаў, гэта—зьвяржэньне разбойніцкай сыстэмы капіталістычнай эксплёатацыі, зьнішчэньне фашысцкай дыктатуры, фінансавага капітэлу шляхам рэвалюцыйна-вызваленчага змаганьня працоўных мас гораду і вёскі, устанаўленьне ўлады рабочых і сялян.

«Працоўныя Нямеччыны, паглядзіце на СССР! Там адбываецца ўзмоцнены рост сацыялістычнай вытворчасьці. Кампартыя заклікае, рыхтуйцеся да змаганьня за перамогу пралетарыяту! Арганізуйце масавае змаганьне супроць фашысцкага ўраду!

На новы грабёж падаткамі адказвайце арганізаваным наступленьнем і патрабаваньнем павышэньня зарплаты, скмігадзіннага рабочага дня. Шляхам сабатажу, нявыплатай падаткаў адказвайце масавае супраціўленьне падатковым законам, падатковаму грабяжу, уведзеным пры дапамозе § 48.

**Стварайце на ўсіх прадпрыемствах баявыя камітэты, чырвоную рабоч

Да ўсебеларускага зьлёту рабочых-вылучэнцаў

Перадаць установам сацыялістычныя мэтады работы заводаў і фабрык

Стварыць ўмовы для пасьпяховай работы вылучэнцаў, узьняць іх тэарытычны ўзровень і кваліфікацыю, аказваць дапамогу ў рабоце—важнейшая задача партыйных і прафсаюзных арганізацый

Першаму ўсебеларускаму зьлёту рабочых-вылучэнцаў—бальшавіцкае прывітаньне

«Мы павінны перарабіць наш апарат, спрасьціць і зрабіць яго таньнейшым, паставіць яго пад кантроль рабочых мас, прывесьці яго ў адпаведнасьць з нашай эканомікай. Уладзімер Ільліч лічыў, што наш апарат павінен быць настольні і простым, каб кожны рабочы мог прыняць удзел у кіраваньні дзяржавай».

(З дакладу тав. Арджанікідзе на XVI зьезьдзе УсеКП(б)

1. Голад Ш.—рабочы кровельшчык, стаж 16 год, працуе заг. будаўнічым аддзелам Белдзяржгандлю. 2. Калесьнікаў,—рабочы-транспартнік, стаж 21 год, працуе у ВСНГ з 20-У—30 г. у якасьці заг. эканомаддзелам. 3. Мухароў Р. І.—сьлесар Добрускай фабрыкі «Гэрой Працы», інспэктар кадраў НКФ. 4. Бутырскі В. О.—токар вагонных майстэрань МББ чыг., вылучаны ў Дзяржбанк на пасаду заг. фондавым аддзелам белканторы Дзяржбанку. 5. Чычыкаў П.—рабочы-сьлесар, стаж 7 год, працуе ў акруговым судзе.

СЬМЯЛЕЙ У ПАХОД ЗА ПЕРАБУДОВУ АПАРАТУ

Пасьпяховае выкананьне вялікіх задач сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі патрабуе максымальнай мабілізацыі ўсяе рабочае клясы на бязьлітаснае змаганьне супроць бюракратызму, цяганіны, чыноўніцка-фармальнага падыходу да справы і клясавых скажэньняў у рабоце савецкага і кааперацыйнага апарату.

Адным з асноўных мерапрыемстваў кампартыі і савецкай улады ў змаганьні з бюракратызмам і іншымі хворымі зьявішчамі ў дзяржапараце зьяўляецца ачышчэньне яго ад варожых, шкодных элементаў і вылучэньне рабочых ад варштату на адказную кіраўнічую работу ў дзяржаўны, кааперацыйны і гаспадарчы апарат.

Асноўнай задачай саюзу савецкіх і гандлёвых служачых зьяўляецца забесьпячэньне адпаведных умоў для найбольш пасьпяховай работы вылучэнцаў у апараце, дапамогі яму ў рабоце і павышэньні іх кваліфікацыі.

Наш Саюз яшчэ да гэтага часу дрэнна спраўляецца з гэтай адказнай задачай. Колькасьць рабочых-вылучэнцаў у апараце невыстарчальная, саюзныя органы не правялі належнае ўвагі да пытаньня вылучэньня і выкананьня партыйных дырэктыў па гэтым пытаньні.

Першы ўсебеларускі зьлёт рабочых-вылучэнцаў савецкага і кааперацыйнага апарату павінен адыграць вялікую ролю ў галіне рашучага пералому ў рабоце саюзу па выкананьні дырэктыў партыі, па вылучэньні і арабочваньні савецкага апарату ў сучасны пэрыяд шырокага сацыялістычнага наступленьня на рэшткі капіталізму ў нашым краі.

РАБОЧЫ - ВЫЛУЧЭНЕЦ ПАВІНЕН СТАЦЬ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ФІГУРАЙ У САВЕЦКІМ АПАРАЦЕ. Толькі апіраючыся на яго магчыма пасьпяховае правядзеньне перабудовы савецкага апарату ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі задач сацыялістычнай рэканструкцыі.

ЦП саюзу саўгандальспужачых упэўнена, што ўся саюзная грамадзкасьць прыме актыўны ўдзел у рабоце першага зьлёту рабочых-вылучэнцаў, які бясспрэчна мабілізуе прафсаюзныя органы і кожнага члена саюзу на змаганьне за баявы, клясава-выразны, танны, зьвязаны з шырокімі масамі працоўных дзяржапарат.

Шырэй разгорнем пралетарскую самакрытыку, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, Сьмялей у паход пад кіраўніцтвам кампартыі, за перабудову дзяржапарату.

Бальшавіцкае прывітаньне рабочым-вылучэнцам — верным дапаможнікам кампартыі ў змаганьні з бюракратызмам.

Старшыня ЦП саюзу савецкіх і гандлёвых служачых ПЛЯТНЁЎ.

1. Б. Бэхэр, рабочы заводу «Бальшавік», стаж 12 год, вылучаны нам. азг. крамы, зам. старш. ЧК № 1. 2. Чарны М. Г., раб. Менск. абутковай фабрыкі, працуе інструктарам ЦК па вылучэньні 3. Адперштэйн—рабочы кравец, стаж 26 год, працуе ў пракуратуры Вярхсуда, 4. Астроўскі К. В., рабочы-друкар, стаж 22 гады, працуе ў Вярхсудзе. 5. Віньніцкі, рабочы-сьлёсар, стаж 7 год, працуе у пракуратуры.

Важнейшае зьвяно партыйна-палітычнай работы

Палітычнае значэньне шэфства на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва вызначана ў пастановах ЦК і ЦКК УсеКП(б) (сакавік 1930 г.) і XVI зьезду УсеКП(б).

Шэфства заводаў над савецкімі установамі пановаму ставіць перад партыйнымі і прафесыянальнымі арганізацыямі шмат сур'ёзных задач у галіне арганізацыі спраўднага рабочага кантролю зьнізу, далейшага паляпшэньня і спрашчэньня савецкага апарату і падрыхтоўкі новых пралетарскіх кадраў для пастаяннай работы ў дзяржапараце.

Шэфства зьяўляецца адным з магутных загаворў у руках пралетарыяту. Праз яго пралетарыят кантролюе шпаркасьць і якасьць выкананьня савецкім апаратам дырэктыў партыі і ўраду, уцягваючы ўсё больш і больш рабочых і работніц у справу навучаньня дзяржаўраму кіраваньню, не адрываючы іх ад непасрэднай работы на прадпрыемстве.

Аднак, пры ўсёй важнасьці гэтага пытаньня, пры тым выключным значэньні, якое надае партыя гэтаму зьвяну масавай партыйна-палітычнай работы, на сёньняшні дзень прыходзіцца канстатаваць зусім нездавальняючую пастаноўку гэтай галіны работы ў буйнейшых гарадох БССР.

Шэфскі рух яшчэ дагэтуль не набыў масавага характару. Ёсьць факты, якія сьведчаць аб яўна нагардлівых адносінах да гэтае важнейшае справы з боку некаторых партыйных і прафесыянальных арганізацый. Некаторыя фабрычна-заводзкія арганізацыі ня толькі не аказвалі патрэбнай дапамогі, але часта паваг ішлі супроць гэтага руху, адмаўляючыся ад пасылкі пастаянных брыгад для работы ў падшэфную ўстанову, матывуючы гэта недахопам актыву на прадпрыемстве.

Райкомы таксама дагэтуль не ўзяліся, як трэба, за гэту справу. Некаторыя з іх, замест жывога, канкрэтнага кіраўніцтва нізавымі арганізацыямі, займаюцца тым, што на некалькі раз разьмяркоўваюць і прымацоўваюць прадпрыемства да ўстаноў. У выніку такіх адносін важнейшае зьвяно партыйна-палітычнай работы, якое набывае ў цяперашні пэрыяд выключна важнае значэньне, ператвараецца ў пусты гук, або сумную павіннасьць для габінэтных работнікаў. Зусім зразумела, што гэта недапушчальна. Органам КК-РСІ трэба зараз-жа сапраўды ўзяцца за арганізацыю шэфства, рашуча ўдарыць на тых, хто пагардліва адносіцца да дырэктыў партыі.

Роля органаў КК-РСІ ў справе кіраўніцтва шэфскім рухам надзвычайна вялікая. Дзеля гэтага трэба, каб уся работа апарату КК-РСІ была перабудавана і дастасавана так, каб можна было лепш і лягчэй накіраваць гэты магутны рух шырокіх пралетарскіх мас на адпаведным сацыялістычным рэчышчы. **М. Ч.**

Без кіраўніцтва і практычнае дапамогі

Праверка становішча з рабочым вылучэнствам у савецкіх установах паказала, што дырэктывы партыі ў гэтай галіне дрэнна праводзіліся ў жыцьцё. Прыкладам можа быць **Дзяржбанк**, у якім з 156 супрацоўнікаў і звыш 60 адказных пасад, рабочых-вылучэнцаў ёсьць усяго 7 чалавек. На вылучэнцаў Дзяржбанку ніхто ніякай увагі не зварочвае. Ня было практычнае дапамогі вылучэнцам, не арганізоўваліся курсы, гурткі і інш. На адварот, назіраліся выпадкі нядбайных адносін да паасобных вылучэнцаў (вылучэнка Аніпшава).

Амаль, што такое-ж становішча ёсьць і ў **Наркампрацы.** Адміністрацыя Наркампрацы ня мае нават выразнага ўяўленьня аб тым, колькі ў іх рабочых вылучэнцаў. Адміністрацыя дала весткі, што ў цэнтральным апараце працуюць два вылучэнцы, а пасьля дэталёвай праверкі іх аказалася 3. Ня гледзячы на пастанову мясцкому аб арганізацыі спэцыяльных курсаў для падняцьця агульных ведаў рабочых вылучэнцаў, яны яшчэ дагэтуль не арганізаваны. Адміністрацыя ўхітрылася «падрыхтаваць» сваіх вылучэнцаў іншым шляхам: адна-му з іх выдала 120 руб. субсыдыі для падвышэньня кваліфікацыі (Ермаловіч).

Па аддзяленьні —**«ГИЗ'а» РСФСР,** з агульным лікам 67 супрацоўнікаў і звыш 20 адказных пасад, рабочых вылучэнцаў—2. На адным з пасяджэньняў мясцкому была вынесена прапанова аб стварэньні ка ўстанове рабочае праслойкі, але... далей слоў не пайшлі. Работы з вылучэнцамі там ніякай не праводзілі. Пасьля настойлівых патрабаваньняў самі вылучэнцы, мясцком нарэшце склікаў адну нараду і на гэтым справа спынілася.

Яшчэ горш абстаіць справа з рабочым вылучэньнем, які працуе ў **Ашчэдкасе.** За кароткі тэрмін ён быў амаль, што па ўсіх пасадах ва ўстахове. Проста іх нельга пералічыць. Пры гэткіх абставінах у вылучэнца склалася цьвёрдая думка пакінуць зноў па вытворчасьць...

Катастрафічнае становішча яшчэ з кватэрнымі ўмовамі: у **Наркамфіне** ёсьць частка вылучэнцаў, якія да гэтага часу ня маюць кватэр, што, зразумела, дрэнна адбіваецца на іх рабоце.

Кайкоў.

Дрошнія навіны з Масквы

(Па тэлефону ад нашага кароспандэнта)

Прыём у беларускія ВНУ і тэхнікумы

Дзяржплан СССР канчаткова зацьвердзіў кантынгент прыёму ў ВНУ і тэхнікумы БССР у 1930-31 годзе.

У ВНУ будзе прынята 3.300 чалавек. У тэхнікумы—10.090. З іх у індустрыяльныя тэхнікумы, падпарадкаваныя ВСНГ —2.990, Наркамзему—3.050, Наркамасьветы—2.160, Наркамаховы здароўя—440, Наркамфіну—300, Белкаапсаюзу—

Палажаньне аб цэнтральным выдавецтве народаў Саюзу

ЦВК СССР зацьвердзіў палажэньне аб цэнтральным выдавецтве народаў Саюзу. У задачу выдавецтва ўваходзіць садзейнасьць разьвіцьцю і ўмацаваньню мясцовых нацыянальных выдавецтваў. Цэнтральнае выдавецтва паказ на садзей нічаць нацыянальным выдавецтвам і школьнай сетцы ў забесьпячэньні наглядным падручнікам і дапаможнымі прыладамі.

Цэнтральнае выдавецтва знаходзіцца пад вядомам Прэзыдыуму Савету Нацы-

Усебеларуская нарада па партасьвеце

За бесьперапынны навучальны год, за ўдарныя тэмпы партыйнай вучобы

Адказьнейшыя задачы рэканструкцыйнага пэрыяду патрабуюць пагалоўнай марксыцка-ленінскай падкаванасьці ўсіх членаў і кандыдатаў партыі, значнага палепшаньня зьместу ўсёй нашай партыйнай асьветы

У сваім дакладзе аб сыстэме і сетцы партыйнай асьветы, пабудаваным на аснове пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б — тав. **Канакоцін** падкрэсьліў тыя адказьнейшыя задачы па ўзбраеньні партыйных мас марксыцка-ленінскай тэорыяй, якія асабліва надвышаюцца ў пэрыяд рэканструкцыі, пры ўмовах вялікага росту нашай партыі.

УВЯЗАЦЬ РЭВАЛЮЦЫЙНУЮ ТЭОРЫЮ З РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ПРАКТЫКАЙ

Рашучае наступленьне на ўсіх фронтох сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе пагалоўнай марксыцка-ленінскай пісьменнасьці ўсіх членаў і кандыдатаў партыі. Асаблівую ўвагу мы павінны зьвярнуць на бальшавіцкае выхаваньне ўступаючых у партыю. Мы павінны падрыхтаваць той беспартыйны актыў рабочых, які зьяўляецца блізкім нашай партыі, які жадае ўступіць у партыю, падрыхтаваць беспартыйны актыў калгасьнікаў, які змагаецца разам з партыяй за сацыялістычную перабудову вёскі.

— Мы адстаем у тэмпах разгортваньня сеткі партвучобы, ахопу беспартыйнага актыву. Галоўны недахоп — гэта тое, што партсетка ў значнай сваёй частцы слаба увязвала пытаньні практычнай работы слухача з той тэорыяй, якую ён вывучаў. У нас яшчэ надзвычай нізкі тэарытычны ўзровень прапагандыстых.

Тав. **Канакоцін** у сваім дакладзе расказваў аб факце на адным з менскіх заводаў, калі прапагандысты давуў такое «клясавае» растлумачэньне: «Таварышы, вы ведаеце чаму ў Амэрыцы ўсе рабочыя ездзяць на аўтамабілях? Дысправа вельмі простая: яны 25 проц. заплацілі Форду, а потым сеў — на машыну і паехаў».

Цяперашні пэрыяд патрабуе паляпшэньня выместу навучэньня, увязкі тэорыі з практыкай. У вымест партвучобы трэба ўключаць барацьбу з правым ухілам, выкрыцьцё карэньняў правага ўхілу, барацьбу з «левымі» загібамі, выкрыцьцё і разбор карэньняў нацыянал-дэмакратызму, барацьбу з нацыянал-апартуністамі і шавіністамі усіх колераў, рашучую барацьбу з вялікадзяржаўным расійскім шавінізмам, які зараз пераходзіць у наступленьне. У нас, у Беларусі, з асаблівай настойлівасьцю трэба вывучаць пытаньні палітыкі і тактыкі Камінтэрну і рэвалюцыйнага руху Заходняй Беларусі і Польшчы.

ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА ПАРТАДКАЗНАСЬЦІ ДЭЗЭРТЫРАЎ З ФРОНТУ ВУЧОБЫ

Тых таварышоў,—кажа тав. Канакоцін,—якія ўхіляюцца ад партыйнай вучобы, трэба прыцягваць у пэнтральную камісію і караць, як за невыкананьне партыйных абавязкаў, асабліва за завочнае навучаньне.

Тав. Канакоцін зьвярнуў увагу на паляпшэньне складу прапагандыстых, на іх падрыхтоўку, ўзмацненьне складу тыпцамі, якія маюць тэарытычную адукацыю.

Пытаньні падрыхтоўкі нацыянальных кадраў набываюць асабліва вялікае значэньне. Вялікая колькасьць прапагандыстых ня ведае беларускай мовы і выкладаюць «слова па-расійску—слова пабеларуску». На беларусізацыю прапагандыскіх кадраў трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, трэба падрыхтаваць прапагандыстаў нацменшасьцяй.

Час пакончыць з кампанейшчынай і сэзонщынай у нашай рабоце. Трэба **картвучобу прыстасаваць да тых тэмпаў, якія мы зараз маем у сацыялістычным будаўніцтве, разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, зрабіць яго мэтадам у рабоце нашых партшкол і гурткоў. Трэба партыйную вучобу ўзяць пад агонь бальшавіцкай самакрытыкі.**

Галоўнае, гэта тое, каб **дабіцца рашучага пералому ў справе ўсёй нашай партыйнай асьветы.**

ШТО ЎХВАЛІЛА НАРАДА

Нарада па партасьвеце ўхваліла бесьперапынны навучальны год і бесьперапынне камплектаваньне для нізавых і сярэдніх зьвеньняў партасьветы.

Уся сыстэма партасьветы перабудавана па аснове пастаноў ЦК УсеКП(б) аб рэарганізацыі акруговага і раённага зьвяна. Нарада вызначыўшы сыстэму і сетку партасьветы, выразна ўстанавіла, што павінна быць за раёнам і што павінна быць за цэнтрам.

Асноўную базу партыйнага выхаваньня неабходна зрабіць у раёне. Для падрыхтоўкі новых членаў і кандыдатаў партыі, актыву камсамолу, беспартыйнага актыву з рабочых, батракоў, калгасьнікаў і беднякоў вызначана **кароткатэрміновая першапачатковая партыйная школа з 3-4 месячным тэрмінам навучаньня.** Нарада ўстанавіла бесьперапыннае ўкамплектаваньне гэтай пачатковай школы. Разам з гэтым, будуць арганізоўвацца гурткі па пытаньнях бягучай палітыкі, кароткатэрміновыя курсы. Вось тое ніізвое зьвяно, за арганізацыю якога адказвае раён.

Асноўная форма сярэдняга зьвяна зьяўляецца **вячэрняя двухгадовая сапартшкола з канчатковым цыклем першага году навучаньня.** Разам з двухгадовай вячэрняй партшколай мы будзем мець марксыцка-ленінскія гурткі, прадметна-матэматычныя гурткі, якія павінны зьяўляцца сталым сярэднім зьвяном партыйнага навучаньня.

У буйных раёнах для падвышэньня тэарытычнага ўзроўню актыву арганізуюцца дэкадныя камвузы. Для сталага кіраўніцтва прапагандыстых у раёнах уключаюцца ў сетку і плян работы семінары прапагандыстаў. Апрача таго, **у кожным раёне арганізуюцца партыйныя габінэты.**

На раённых камітэты ўскладаюцца мерапрыемствы па падвышэньні кваліфікацыі і спэцыялізацыі пайных вядо-

водзіць курсы ячэйковага і раённага актыву, падрыхтоўваць нізавое зьвяно і часткова сярэдняе зьвяно прапагандыстых.

Пры вызначэньні выразнасьці ў сетцы партасьветы трэба адначыць розьніцу арганізацыйных форм партасьветы ў горадзе і ў вёсцы.

ПАРТВУЧОБУ — ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Зараз патрабуецца пабудова партшколы на прадпрыемствах і абавязкова наводзе вытворчага прынцыпу. Дзе гэтыя прадпрыемствы маленькія—трэба будзе аб'яднаць па 2-3 прадпрыемствы ў адную школу, каб добра іх абсталяваць, каб у нас школы не займаліся ў сталоўцы заводу, ці ў пажарным дэпо, як гэта мае месца ў Менску. У горадзе будуць праводзіцца курсы-канфэрэнцыі па цэхах.

Пастанова нарады гаворыць аб неабходнасьці захаваньня вытворчага прынцыпу і ў вёсцы. Партасьвета ў вёсцы будуецца ў калгасах, саўгасах, пры буйных ячэйках, а дзе невялічкая колькасьць партыйцаў — аб'яднаюцца некалькі калгасаў разам. У вёсцы будуць праводзіцца кароткатэрміновыя курсы-канфэрэнцыі батракоў і калгасьнікаў.

У буйных гарадох будуць вячэрнія камвузы. Будуць праводзіцца 3-хмесячныя курсы райпартактыву пры камвузе Беларусі.

ВУЧОБА КІРУЮЧАГА ПАРТАКТЫВУ

Вышэйшая форма партасьветы застасецца пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту партыі: да гэтай формы адносіцца беларуская партшкола (дзённая і вячэрняя), беларускі камвуз (дзённы, вячэрні і завочны), курсы пры камвузе Беларусі, курсы падрыхтоўкі прапагандыстых для сярэдняга зьвяна, беларускі дом партасьветы (у Прылуках), дзе работа кароткатэрміновых курсаў для цэнтральнага і рабочага кіраўнічага актыву будзе ўлучацца з адначыскім апошнім.

Да вышэйшай формы партасьветы адносіцца пэрыядычныя лекцыі для цэнтральнага актыву. У вышэйшую форму партасьветы ўваходзіць таксама і ўся сыстэма завочнага вышэйшага навучаньня.

***

Нарада ў сваіх пастановах вынесла рад рашэньняў па ўзмацненьні палітвучобы ў камсамоле, па ўзмацненьні прапагандыстымі пагранічных раёнаў.

Пачатак заняткаў у сетцы партыйнай асьветы наступны: у пачатковай школе — з 1 кастрычніка; у савпартшколах — з 15 кастрычніка.

Камплектаваньне сеткі партасьветы павінна пачацца неадкладна пасьля райканфэрэнцый, якія будуць скліканы гэтымі днямі.

Матар'ялы ўсебеларускай канфэрэнцыі па партасьвеце будуць выданы асобна

Рабочы-вылучэнец-застрэльшчык ударніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва

«Асноўная задача шэфства павінна заключацца ў штодзённым кантролі з боку заводаў—шэфаў над выкананьнем падшэфным апаратам важнейшых дырэктыў партыі і ўраду. Іменна штодзённае азнаямленьне рабочых з практычнай работай установы створыць магутны рэзэрв новых пралетарскіх кадраў для пастаяннай работы ў дзяржаўным савецкім апараце» (з пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

Да апошняга часу ў радзе важнейшых гаспадарчых і дзяржаўных установаў ня было ні аднаго рабочага-вылучэнца. Па г. Менску на 1-га красавіка ў 14 установах, у тым ліку і ў ВСНГ, ня было ні аднаго вылучэнца, у некаторых па 1-2 вылучэнцы, толькі ў невялікай колькасьці ўстаноў процант вылучэнцаў быў больш-менш здавальняючы.

Першы зьлёт вылучэнцаў г. Менску ў красавіку даў некаторы штуршок у галіне арабочваньня апарату але карэннага пералому мы яшчэ і па сёньняшні дзень ня маем.

Агляд становішча вылучэнства ва ўстановах, праведзены нядаўна ЦП саюзу саўгандальслужачых, сходы і зьлёты вылучэнцаў у гарадох БССР яскрава паказваюць, што некаторыя ўстановы недаацэньваюць значэньня вылучэнцаў і не аказваюць ім патрэбнай дапамогі. На зьлётах мы мелі характэрныя выступленьні, якія малююць сапраўднае становішча вылучэнства. Напрыклад, т. **Нэйштадт** з ЦРК гаворыць: «мы сустрэлі шалёнае супраціўленьне тэй часткі работнікаў нарыфорыі ЦРК, якія нагул настроены супроць вылучэнства рабочых.

Ёсьць выпадкі, калі вылучэнцы не сустракаюць таварыскіх адносін і дапамогі з боку адказных работнікаў. Тав. **Хінчук** (ЦРК) расказвае: «прыходзіць вылучэнец **Хануцін** да т. З. і гаворыць яму аб тым, што ў нас ёсьць зазіналыя тавары, якія трэба зараз-жа [illegible] дзеля гэтага патрэбны [illegible] рублёў на 30. Тав. [illegible] выслухаць вылучэнца [illegible] яго не зьварцуў».

Ня лепш адносіцца да вылучэнцаў і нашы мясцкомы. Рассказвае [illegible] (НКЮ) расказвае: «на працягу 3 месяцаў маёй работы МК ні разу ня склікаў нарады вылучэнцаў і не пацікавіўся як яны працуюць». Такое зьявішча мае месцы і ў іншых установах. Зусім нездавальняюча стаіць справа з вучобай вылучэнцаў.

Усе гэтыя факты яскрава паказваюць, што ў справе вылучэнства патрэбны карэнны пералом. Партыйныя ячэйкі і прафарганізацыі на мясцох павінны рашуча ўзяцца за выкананьне дырэктыў партыі, самі-ж вылучэнцы павінны патрабаваць выкананьня дырэктыў.

Перад вылучэнцамі стаіць вялікая задача ў галіне разьвіцьця сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рабоце апарату. Вылучэнцы маюць багаты вопыт у гэтым напрамку ад сваіх фабрык і заводаў. Трэба гэты вопыт перанесьці ў савецкі апарат, паказаць на справе як трэба працаваць па-ўдарнаму. Вылучэнец павінен стаць застрэльшчыкам у гэтым пытаньні, узяць на грамадзкі буксір адсталыя ўстановы, часткі ўстаноў, арганізаваць «сквозные» брыгады і г. д.

Трэба, каб рабочыя-вылучэнцы трымалі цесную сувязь з рабочымі заводаў, рабілі-б справаздачы перад імі і уважліва прыслухоўваліся да іх голасу.

Рабочы-вылучэнец павінен быць таксама ініцыятарам шырокага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі ў **установах, весьці рашучае змаганьне** з усімі нездаровымі зьявішчамі і скажэньнямі лініі партыі, якія ёсьць у нашым апараце, быць актыўным рабкорам і насьценкорам.

Асаблівую ўвагу трэба будзе зьвярнуць на вучобу вылучэнцаў.

ЦП саюзу разам з адпаведнымі арганізацыямі трэба будзе арганізаваць адпаведныя курсы і гурткі, каб вылучэнцы змаглі-б пасьля сваёй работы папоўніць свае тэарытычныя веды. Трэба ўрэгуляваць пытаньне з патрэбай вылучэнцаў. Мы маем выпадкі, калі вылучэнцаў перагружаюць грамадзкай работай, дзякуючы чаму яны ня маюць магчымасьці вучыцца і павышаць сваю кваліфікацыю. Вось прыблізна галоўныя задачы, якія стаяць перад вылучэнцамі.

Рабочыя-вылучэнцы, абмяняўшыся на зьлёце практыкай сваёй работы з новымі сіламі, пад кіраўніцтвам кампартыі, возьмуцца за работу па паляпшэньні савецкага апарату.

ГЛІКІН.

Тав. Леві, І. І., рабочы гарбарні «Бальшавік», стаж 17 год, вылучаны інструктарам фондавага аддзелу Дзяржбанку. Тав. Альпэровіч Б., рабочы друкарні імя Сталіна, стаж 18 год, вылучаны загадчыкам крамай МЦРК.

Не дапамагалі вылучэнцу

У нас (Аргбуд) ёсьць вылучэнец—рабочы гарбарні т. Дабрыцкі. Апошні ў свой час быў прысланы АК на пасаду заг. камэрцыйнага аддзелу. Але прайшло ужо 8 месяцаў, а ён усё яшчэ працуе на пасадзе не загадчыка, а памесьніка.

Цяпер, калі пытаньне аб пралетарскіх кадрах з усёй рашучасьцю пастаўлена на парадак дня, не пашкодзіла-б адпаведным арганізацыям, якія вылучылі тав. Дабрыцкага, а таксама партыйным і грамадзкім арганізацыям, якія абслугоўваюць нашу ўстанову, пацікавіцца, як скарыстоўваецца рабочы-вылучэнец, як ён знаёміцца і вучыцца працаваць на тэй рабоце, на якую яго паставіла партыя, як нашыя спэцыялістыя па камэрцыйнай часьцы ўводзяць яго ў «сьвятую-сьвятых» камэрцыйнай спэцыяльнасьці, як кіраўнікі ўстановы кіруюць яго работай.

На жаль, як быццам дагэтуль ніхто і ня цікавіўся, ніхто і не падумаў аб гэтым. А трэба было-б гэта зрабіць, бо калі крыху прыглядзіцца, дык адразу выяўляецца маленькае няправільнага скарыстаньня вылучэнца: тут і абавязкі справавода, тут і абавязкі ледзь не рассыльнога.

Лічу, што МК павінен пацікавіцца гэтым, хаця-б на 8-м месяцы работы Дабрыцкага ў нас.

Неспэцыялісты.

У ПОШУКАХ КІРАЎНІЦТВА

Да гэтага году Лесбел ня меў ні аднаго рабочага-вылучэнца ў сваім апараце. На працягу першага паўгодзьдзя 1929-30 г. ён прыняў у апарат 12 вылучэнцаў (з якіх 9 толькі ў маі 1930 г.): па камсамольскай мабілізацыі 3 чалавек, а курсаў ЦК партыі 5 ч. і менскіх курсаў дрэваапрацоўшчыкаў 4 чалавек. Усе вылучэнцы, за выключэньнем трох, прыйшлі ў апарат непасрэдна ад варштату.

У якіх-жа умовах прыходзіцца працаваць рабочым-вылучэнцам?

Рабочага камсамольца **Штэйнбаха** паставілі на чале справы рацыяналізацыі лясной прамысловасьці, ня даўшы яму ніякай установкі. Штэйнбах пачаў весьці работу бяз усякай дапамогі з боку адміністрацыі.

Штэйнбах шмат часу траціў спачатку на хаду ў пошуках кіраўніцтва, потым пачаў езьдзіць па прадпрыемствах. Работы сваёй ён ня ведаў і не аўладаў ёю да апошняга часу. Урэшце зьявіліся настрої расчараваньня, імкненьні пакінуць установу.

Вылучэнцаў, прыйшоўшых з курсаў ЦК, разьмясьцілі па адпаведных пасадах, якія былі вольнымі, аддалі загад, вызначылі пэнсію—на гэтым справа і скончылася.

Ні адміністрацыя, ні ячэйка, ні мясцком сур'ёзна справай скарыстаньня вылучэнцаў не займаліся, калі ня лічыць выпадковых, запытаньняў (паміж іншым) сакратара ячэйкі: «ну, як вы тут працуеце?».

Сваіх абавязкаў вылучэнцы ня ведаюць. Што ім рабіць, з чаго пачынаць —невядома. Асабліва нялёўка становішча тых, хто займае кіруючыя пасады (кіраўнікі груп).

Апарат адносіцца пасыўна: «адказваюць, калі што запытаеш». Кожны робіць, што прыдзецца: езьдзіць у камандыроўкі, знаёмяцца з работай па мясцох, вырашаюць паасобныя бягучыя пытаньні, прыглядаюцца да работы старых работнікаў, высьвятляюць паасобныя пытаньні па даручэньнях. Але мэтавай установкі няма. Першая вучоба ідзе па шляху «чаму-небудзь і як-небудзь», а адсюль атрымліваецца «усяму і нічаму».

Вылучэнцы жадаюць вучыцца. Умовіліся аб адчыненьні курсаў ва ўстанове. Знайшліся добраахвотныя настаўнікі—маладыя спэцыялісты. А справа ўсё тармозіцца. Спачатку ў ячэйцы сказалі «няхай кончыцца XIII партыезд», потым пачалі спасылацца на адпускную кампанію, а хутка зноў пачнуцца ўзмоцненыя лесазагатоўкі.

Чыстка апарату выявіла недапушчальныя адносіны да вылучэнцаў з боку паасобных супрацоўнікаў, на якія ні адміністрацыя, ні грамадзкія арганізацыі ніяк не рэагавалі.

Сама адміністрацыя пагаршае узаемаадносіны з вылучэнцамі. Назначылі вылучэнца Басіна кіраўніком фанэрнай групы, ня вызваліўшы ад гэтай пасады былога кіраўніка—інжынэра і не паведамілі яго аб гэтым. 1 з пал. месяцы ў групе было 2 кіраўнікі, якія самі ня ведалі аб такім здарэньні. Калі-ж гэта высьвятлілася, то меў месца інцыдэнт паміж інжынэрам і вылучэнцам, які абвострыў іх адносіны і дрэнна адбіўся на рабоце.

Наогул, патрэбныя ўмовы для работы вылучэнцаў добрае, за выключэньнем паасобных непаладак з кватэрамі.

Па сваім клясавым і прафесыянальна-дзеловым падборы склад вылучэнцаў Лесбелу вельмі добры. Задача адміністрацыі і грамадзкасьці Лесбелу дапамагчы сваім рабочым-вылучэнцам аўладаць патрэбнымі ведамі і справай кіраўніцтва.

Л.

Адкрылася Усебеларуская нарада рабочых-вылучэнцаў

Учора, а 7 гадзіне ўвечары ў клюбе савецкіх і гандлёвых служачых адкрылася ўсебеларуская нарада рабочых-вылучэнцаў. На нараду прыбыла 67 дэлегатаў. Нараду адкрыў старшыня ЦП Савецкіх і гандлёвых служачых т. **Плятнёў**, які ў сваёй уступнай прамове спыніўся на пытаньнях паляпшэньня дзяржапарату і вылучэньня рабочых.

З дакладам аб папярэдніх выніках чысткі савецкага апарату выступіў нам. Наркома РСІ БССР т. **Гурэвіч.**

Сёньня нарада заслухае даклад ЦП саюзу савецкіх служачых аб становішчы вылучэнцаў.

Да ведама падпісчыкаў „ЗЬВЯЗДЫ“

З учарашнім нумарам газэты „ЗЬВЯЗДА“ разасланы дармовы дадатак—газэта **„ПРАФРУХ“ № 19**

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

Дырэктывы аб загатоўках буйной рагатай жывёлы павінны быць поўнасьцю выкананы

Да суровай адказнасьці тых, хто займаецца месьніцтвам і цяганінай у справе мясазагатовак

БАЛЯНС БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ

16,5 проц. месячнага заданьня далі загатоўкі рагатай жывёлы за першую дэкаду ліпеня

Для прэміяваньня здатчыкаў жывёлы з 1-га Чэрвеня выдзелен спэцыяльны, даволі вялікі фонд прамтавараў.

Ня гледзячы на гэта, пічбы загатовак буйной рагатай жывёлы за першую дэкаду ліпеня вельмі пагражаючыя.

Бабруйская акруга выканала толькі 33,2 проц. месячнага заданьня, Гомельская 19,8 проц., Мазырская 17,1 проц., Магілеўская 13,9 проц., Менская 11,8 проц., Аршанская 9,6 проц., Віцебская 6,6 проц., Полацкая 4,7 проц.

УСЯГО ПА БССР ВЫКАНАНА 16,5 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ЗАДАНЬНЯ.

Такое выкананьне загатовак зьяўляецца мізэрным. Яно пагражае ня толькі рабочаму забесьпячэньню, але і здавальненьню патрэб грамадзкага харчаваньня.

Дрэннае выкананьне загатовак буйнае рагатае жывёлы можна тлумачыць выключна няўважлівымі адносінамі мясцовых арганізацый да гэтага важнага пытаньня.

Мы бачым, што там, дзе гэтаму пытаньню аддаецца адпаведная ўвага, справа абстаіць больш-менш спрыяюча. БАБРУЙСКАЯ АКРУГА, ЯКАЯ СПЭЦЫЯЛЬНА КАМАНДЫРАВАЛА АДКАЗНЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ ДЛЯ ЎЗМАЦНЕНЬНЯ ЗАГАТОВАК БУЙНОЙ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ Ў РАЁНАХ, СТАІЦЬ НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ. Іншыя-ж акругі, як відаць, не ўявілі сабе таго, што рабочая забесьпячэньне цалкам залежыць ад ходу загатовак у БССР, бо нельга разьлічваць на прывоз жывёлы з іншых рэспублік.

Такім чынам, трэба прыняць усе меры да ўзмацненьня загатовак і нагнаць упушчанае, ні ў якім выпадку не дапускаючы выдаткаваньня фондаў прэміяваньня на іншыя мэты.

Тэлеграма сакратара ЦК КП(б)Б тав. Васілевіча ўсім акруговым камітэтам рэзка завастрае пытаньне аб загатоўках буйной рагатай жывёлы. Тэлеграма прапануе катэгарычна скончыць з месьніцтвам, з пасыўнасьцю і бязьдзейнасьцю ў гэтай справе. Усякія пасыўныя адносіны да загатовак, імкненьне ўрваць больш для сваёй акругі, будуць кваліфікавацца як зрыў важнейшай работы па рабочым забесьпячэньні.

Другое пытаньне, якое мае зараз вялікае значэньне, гэта ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АДКОРМУ ЖЫВЁЛЫ.

Савет Народных Камісараў ад 18 сакавіка г. г. прапанаваў адкарміць у гэты сэзон 29.000 галоў буйной рагатай жывёлы. Да гэтай работы трэба неадкладна прыступіць, каб быць падрыхтаванымі да адкорму, які павінен пачацца ў першых пічбах верасьня. Неабходна заразжа падрыхтаваць 12.000 галоў жывёлы, абстапяваць валоўні і адкормачныя пункты. Інакш гэта важнейшае мерапрыемства рабочага забесьпячэньня можа быць сарвана.

Некалькі слоў аб КАНТРАКТАЦЫІ ЖЫВЁЛЫ. Кампанія па кантрактацыі жывёлы ў нас проста правалена. Плян кантрактацыі па буйной рагатай жывёле выкананы ў разьмеры 20 проц., па мападняку ў разьмеры 24,6 проц., па сьвіньнях 33 проц.

Неабходна дабіцца зьняцьця з кантрактацыі поўнасьцю, хоць тэй мінімальнай колькасьці жывёлы, якая ўжо закантрактавана.

Мясазагатоўкі могуць быць выкананы з посьпехам толькі пры належнай увазе з боку партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. Бяз іх дапамогі загатоўчыя арганізацыі ня ў сілах дабіцца патрэбнага эфэкту.

Нельга забываць, што мясная праблема зьяўляецца важнейшай задачай эканамічнай палітыкі партыі і савецкай улады.

І. К.

Марна гінуць сотні тысяч руб.

—Страты ў мясной прамысловасьці дасягаюць вялікіх разьмераў.—Мы не навучыліся рацыянальна скарыстоўваць адкіды ўбою

Барацьба са стратамі ў мясной прамысловасьці ёсьць частка барацьбы за сырацэньне мясное праблемы.

У Беларусі з-за нязначнай колькасьці кваліфікаваных працаўнікоў у галіне загатовак жывёлы і транспарту жывёлы да месца ўбоя, страты мясных рэсурсаў вельмі вялікія. Пры перавозцы жывёлы па чыгунцы мы трацім 10-15 проц. жывой вагі, тады, як нармальная страта павінна быць ня больш 3 проц. Пры гужавым транспарце загатоўшчыкі не зварачаюць увагі на стомленасьць жывёлы, на яе кармленьне, дапускаюць вялікія перагоны. Рад дасьледаў мяса праз 24 гадзіны пасьля ўбоя паказвае, што жывёла забівалася ў стадыі моцнай стомленасьці і траціла шмат вагі.

Пры чыгуначным транспарце адміністрацыя чыгункі, праваднікі вельмі грэшна абслугоўваюць жывёлу, горш за ўсё абстаіць справа з свячасовым вадапоем.

Мясцамі назіраецца нават барбарскія адносіны да жывёлы, якая перавозіцца па чыгунцы.

Беларускія рэзьніцы абсталяваны надзвычай прымітыўна. Яны ня маюць нават крытых памяшканьняў для жывёлы і вадапою. Жывёла, якая прыбыла пасьля доўгага перагону па грунтовай дарозе, або па чыгунцы, патрабуе двухдзённага адпачынку для частковага аднаўленьня страчанай вагі. На нашых-жа рэзьніцах ня толькі няма добрых памяшканьняў для жывёлы, няма нават вадапоеў. Жывёла літаральна худзее на вачох, і таму працаўнікі рэзьніцы імкнуцца забіваць яе зараз-жа пасьля прыгону.

Пры забоі жывёлы мы трацім 50 проц. агульнага выхаду крыві, а ў некаторых выпадках і больш. Між тым, гэты высока-каштоўны прадукт можна скарыстаць поўнасьцю, на ўсе 100 проц.

Вельмі нядбайнае зьняцьце скуры вядзе да страты каля 40 проц. асартымэнту. Пры разьдзеле тушы мы маем толькі каля 70 проц. нармальнага выхаду харчовых тлушчаў, рэшта траціцца; у той час, калі мы адчуваем вострую патрэбу ў тлушчах. Вельмі кепска ўцілізуюцца прадукты ўбою, якія могуць даць вялікі прыбытак, і апрацоўку якіх можна арганізаваць на самых маленькіх рэзьніцах.

Калі прыняць пад увагу, што на ўсіх беларускіх рэзьніцах забіваецца больш 100.000 буйной рагатай жывёлы і сьвіней у год, дык уцілізацыя адкідаў убою можа даць ня менш 50.000 руб. і вялікую колькасьць карысных харчовых сродкаў.

Мы мала ўвагі зварачаем на адкормачныя апэрацыі, якія зьяўляюцца вельмі важнай задачай пры вырашэньні мясной праблемы. Адкормачныя апэрацыі павінны даць лішнія дзесяткі тысяч пудоў мяса. А ў нас часта пры адкорме атрымліваецца ня прыбытак у вазе, а наадварот, страты.

Вэтэрынарна-санітарны нагляд на рэзьніцах кульгае.

Неабходна наладзіць бактэрыялёгічныя досьледы тушэ, пры кожнай рэзьніцы пабудаваць невялікія ляднікі для захаваньня забітай жывёлы, а таксама прымітыўныя стэрэлізацыйныя прылады.

Трэба арганізаваць на мясцох штабы па барацьбе са стратамі ў галіне мясной прамысловасьці, уцягнуўшы ў гэту справу кваліфікаваных працаўнікоў і інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Трэба арганізаваць на рэзьніцах сацыялістычнае спаборніцтва, па барацьбе са стратамі, па лепшым скарыстаньні адкідаў убою.

Вытворчыя нарады па рэзьніцах даготуль адыгрывалі нязначную ролю. Трэба ажывіць дзейнасьць вытворчых нарад, усялякім чынам заахвочваць тых рабочых, якія ўнясуць рацыяналізатарскія прапановы. Мільёны рублёў эканоміі, тысячы пудоў карысных мясных прадуктаў можа даць рацыяналізацыя ўбою.

Прафэсар ВОЛЬФЭРЦ.

ПАЗЫКА „ПЯЦІГОДКА—ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ“

УДАРНАЙ РАБОТАЙ КАМІСІЙ САДЗЕЙНАСЬЦІ ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ПОСЬПЕХ ПАЗЫКІ

РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ ПРАПАГАНДУ НОВАЙ ПАЗЫКІ

Дзе падпіска ідзе самацёкам

з-за бязьдзейнасьці фабкомаў і камсодаў

Ужо некалькі дзён на менскіх фабрыках і заводах праводзіцца падпіска на пазыку «Пяцігодка за чатыры гады». Вынікі работы паказваюць, што на некаторых прадпрыемствах, падпіска ідзе стыхійна, самацёкам, растлумачальная работа вядзецца слаба, камісіі садзейнасьці нічога ня робяць, заўкомы і партыйна-камсамольскія арганізацыі мала што робяць для правядзеньня кампаніі. Сацспаборніцтва, як мэтад лепшай рэалізацыі, яшчэ не ажыцьцяўляецца. Фабрычна-заводскі друк зусім слаба рэагуе на падпісную кампанію.

Узорную работу правялі заводы «Камунар» і «Бальшавік». Добра арганізаваная растлумачальная работа дала патрэбныя вынікі: на заводзе «Камунар» падпіскай ужо ахоплена 50 проц. усіх рабочых, у бляшаным цэху ахоплена 80-85 проц. рабочых. Ёсьць выпадкі групавой падпіскі на 100 проц. месячнага заработку. Мэтад сацспаборніцтва апраўдаў сябе: цэх з цэхам, брыгада з брыгадай спаборнічаюць па лепшую падпіску, на 100 процантны ахоп рабочых і г. д. Гэтыя два ўдарныя заводы хутка скончаць усю работу па падпісцы.

На фабрыцы «Беларуска», абутковай фабрыцы, хэмфармзаводзе, гуце «Пралетары» і інш. толькі цяпер пачынаюць «ставіць» пытаньне аб пазыцы.

Дрэнна абстаіць справа і на заводзе «Дрэваапрацоўшчык»: з 600 рабочых падпіскай ахоплена 265, сума падпіскі дасягнула 17.000 руб., або 40 проц. агульнага двухтыднёвага фонду зарплаты. Ёсьць некалькі выпадкаў падпіскі па суму менш паўмесячнага заработку. Гэта тлумачыцца слабай работай камісій садзейнасьці і ФЗМК. Заўком да гэтага часу ня ведае, у якім стане знаходзіцца падпіска на пазыку. Не арганізавана сацспаборніцтва, ёсьць зрэдчыя выклікі ў насьценгазэце асобных т[illegible]шоў і толькі.

Падягнуўся завод «Энэргія». На 19 ліпеня мы там маем 300 рабочых (⅓ усіх рабочых заводу, палова ўсіх што-цяпер працуюць, апроч адпускных, падпісаліся на пазыку. Сабрана падпіскі на 21.000 руб., або 40 проц. агульнага паўмесячнага фонду зарплаты. Завод «Энэргія» ўступіў у сацспаборніцтва [illegible]

Гомельская электрастанцыя--першая па падпісцы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). На гомельскай электрастанцыі камісія садзейнасьці правяла значную растлумачальную работу—арганізаваны гутаркі па ўсіх цэхах, разьвешаны лёзунгі, плякаты. На агульным сходзе калектыву быў заслухан даклад аб мэтах і значэньні пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады». Дагэтуль падпіска дасягнула 5.700 руб., пры фондзе зарплаты за 2 тыдні ў 5.000 рублёў. Рабочыя Канавалаў, Левін, Васільеў, Шырок, падпісаліся на месячны аклад.

Калектыў СНК выклікае

За 3 дні падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» у калектыве СНК дала 4.460 руб. У большасьці супрацоўнікі падпісваюцца на 100 проц. месячнага акладу. На агульным сходзе калектыў СНК прыняў выклік Наркамфіну і ў сваю чаргу выклікаў на поўны ахоп супрацоўнікаў-калектываў ЦК КП(б)Б, ВСНГ, Наркамюсту і дзяржпляну. Падпіска працягваецца.

„Налёт“ рабочых брыгад на крэдытныя ўстановы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Брыгады «Полесской Праўды» і АКК-РСІ зрабілі налёт на ашчадныя касы і банкі, з мэтай праверкі падрыхтаванасьці гэтых устаноў да падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» і становішча з пакрыцьцём запазычанасьці па 3-й пазыцы.

Брыгада выявіла, што ў радзе нізавых ашчадкас падрыхтоўка — на мёртвым пункце. Ашчадкаса акрэга ўсё яшчэ склае пляны. Гомжылсаюз нічога ня робіць, каб пашырыць пазыку сярод сэзонькіраў. На тэлефонным станцыі і ў райсаюзе працаўнікі ашчаднай касы нічога ня ведаюць аб падпісной кампаніі. На заводзе імя Ланцуцкага падрыхтоўка яшчэ не пачалася.

У радзе устаноў ёсьць вялікая запазычанасьць па 3-й пазыцы: у акрэга на 4.000 руб., у Гомжылсаюзе на 2.500 руб., у Палессаюзе—на 1700 р. і г. д. Запазычанасьць камунбанку па ўзносах на 3-ю пазыку складае 38.000 руб. Налёт брыгады даў значны штуршок у справе разгортваньня кампаніі.

На 108 проц. месячнай зарплаты

Служачыя Заслаўскага РВК атрымліваюць зарплаты ў месяц 1.416 р., а падпіса[illegible]ліся на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на 1.535 руб., што складае 108 проц. месячнай зарплаты. Калектыў выклікаў пасьледаваць яго прыкладу Заслаўскае спажывецкае т-ва і т-ва сельгаскрэдыту.

Спыніць канкурэнцыю контрагэнтаў!

Яшчэ за два тыдні да пачатку кампаніі рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» Менская акруговая камісія садзейнасьці разьмеркавала клієнтуру паміж контрагэнтамі — ашчадкасай, Дзяржбанкам і Самцентрамкрэдытам.

Ня гледзячы на тое, што кожнаму з контрагэнтаў быў дадзены сьпіс устаноў, якія прымацаваны да яго і якія ён павінен абслугоўваць, наглядаецца канкурэнцыя контрагэнтаў, у мэтах захопу клієнтуры, што ўносіць паралелізм у рабоце.

Дзяржбанк, напрыклад, абвясьціў некаторым установам, якія да яго не прымацаваны аб тым, што ён праводзіць у іх кампанію разьмяшчэньня пазыкі. У выніку можа здарыцца, што два контрагэнты зьявяцца ў адну і тую-ж установу для правядзеньня аднэй работы.

Белжылсаюз, які прымацаваны да ашчадкасы, зрабіў заяўку на замацаваньне аблігацый новай пазыкі ў Дзяржбанк. Апошні замест таго, каб паслаць прадстаўніка Белжылсаюзу ў ашчадкасу, прыняў гэту заяўку і зарэгістраваў яе. Такое парушэньне ўстаноўленага парадку, разьмеркаваньня клієнтуры, зьяўляецца зусім недапушчальным.

Зусім ніякай работы дагэтуль не правёў Самцентрамкрэдыт. Яшчэ ні ў аднэй арцелі не праведзены сходы па пытаньні аб новай пазыцы. Рэалізацыя пазыкі «Пяцігодка за чатыры гады» па ўстановах, якія прымацаваны да Самцентрамкрэдыту, праводзіцца чарапашымі тэмпамі.

Менакрашчадкаса нічога ня робіць для наладжваньня выязду на месцы, у мэтах абмену аблігацый. Пляны выязду дагэтуль не складзены, што затрымлівае складаньне агульнага пляну абмену па горадзе.

Больш плянавасьці і выразнасьці ў правядзеньні кампаніі.

ДЭВІ.

Пачалася падпіска на вёсцы

— Рабочыя саўгасу «Івань», Бабруйскай акругі пачалі падпіску на новую пазыку. З 96-ці рабочых саўгасу падпісалася ўсяго 54 чал. на суму 2600 рублёў.

***

УСЕ ТЭРМІНЫ ПРАЙШЛІ--

аднак, многія раёны зусім не падрыхтаваны да уборачнай кампаніі. У Талачынскім, Дубровенскім, Старадароскім і Бярэзінскім раёнах уборка пад пагрозай

Узяць на грамадзкі буксір раёны, якія плятуцца ў хвасьце

РУЙНУЮЧЫ УДАР ПА КУЛАЦТВУ, ЯКОЕ ПРАБУЕ ДЭЗАРГАНІЗАВАЦЬ УБОРАЧНЫ ФРОНТ

У баявой гатоўнасьці

КАМУНА ІМЯ СТАЛІНА (МЕНШЧЫНА) ПРЫСТУПІЛА ДА ЎБОРКІ СЕНАЖАЦІ 1 ПОЎНАСЬЦЮ ПАДРЫХТАВАНА ДА ЎБОРКІ ЖЫТА. УВЕСЬ ІНВЭНТАР АДРАМАНТАВАНЫ.

ТАКСАМА ПАДРЫХТАВАНЫ І ПАПАР ПАД ЖЫТА. КАМУНАРЫ ПРАЦУЮЦЬ ДРУЖНА І АРГАНІЗАВАНА.

БРЫГАДЗІР «ЗЬВЯЗДЫ»

ПАЛЯНСКІ.

БЯРЭЗІНСКІ РАЕН АДСТАЕ

Калгасы ня рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі

Многія калгасы Бярэзінскага раёну слаба падрыхтаваны да ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Не падрыхтаваны, напрыклад, да ўборачнай кампаніі калгас «Новы Сьвет». У калгасе не адрамантаваны с. - г. інвэнтар і ўборачныя машыны. Месяц назад «Новы Сьвет» атрымаў жнівярку, якая да гэтага часу ня зложана і ляжыць у скрыні без усялякай карысьці.

Гумны для хаваньня снапоў не падрыхтаваны. Сенажаць для калгасу 1 на сёнешні дзень яшчэ не адведзена. Калі яна будзе адведзена—невядома.

Калгас «Мопат» прыступіў да ўборкі сенажаці. С.-г. інвэнтар адрамантаваны. Будынкі для хаваньня снапоў і сена падрыхтаваны. У калгасе адчуваецца вострая нястача рабочай сілы. Трэба будзе наняць рабочых, каб поўнасьцю ўбраць увесь ураджай. Праўленьне калгасу да гэтага часу ня ведае, колькі будзе не хапаць рабочых рук. Трэба падкрэсьліць, што кулацкія элемэнты імкнуцца сарваць уборачную кампанію. У склад самога калгасу пралез кулак Цьвірка, які раней плаціў 500 рублёў падатку. Цьвірка вядзе ў калгасе дэзарганізатарскую работу і імкнецца пасварыць калгаснікаў паміж сабою. Мясцовыя арганізацыі на гэты факт зусім не рэагуюць.

Нездавальняюча падрыхтаваўся да ўборачнай кампаніі калгас «Камінтэрн». Пляну ўборкі няма. Для хаваньня абмалочанага насеньня ў калгасе няма ніводнага складу. Не хапае ўборачных машын. Напрыклад, калгас ня мае малатарні, што стварае ў калгасе напружанае становішча.

Т—і.

Бясплянавасьць і самацёк

Плян уборачнай кампаніі ў ТАЛАЧЫНСКІМ раёне (АРШАНШЧЫНА) да сёнешняга дня не даведзен да калгасаў, саўгасаў, с.-саветаў і вёсак. Ня дзіва, што ў калгасах і саўгасах няма ўпасных плянаў і рабочых праграм правядзеньня ўборачнай кампаніі. Калгасы і індывідуальны сэктар да ўборкі ўраджаю не гатовы.

У калгасе імя СТАЛІНА зусім непадрыхтаваны памяшканьні для хаваньня ўраджаю. Таксама няма памяшканьняў для хаваньня ўраджаю і ў калгасе «ЯСНЫ ДЗЕНЬ». Калгас ня мае ніякага пляну ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Зусім не падрыхтаваны да слябы калгас «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ». Пляну ўборкі ў калгасе няма. Не хапае ўборачных машын і перавозачных сродкаў, што ставіць пад пагрозу ўборку ўраджаю ў калгасе.

Калгас «КАМСАМОЛЬСКАЯ ПРАЎДА» рыхтуецца да ўборкі без усялякага пляну. Спаборніцтва ў калгасе ў сувязі з уборкай не разгорнута. Як дасягненьне, трэба адзначыць, тое, што калгас «Камсамольская Праўда» адрамантаваў свае ўборачныя машыны.

У калгасе імя XII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б ня скончан рамонт машын, бо не хапае запасных частак. Гэты калгас таксама ня мае дакладнага пляну ўборачнай кампаніі. Складзены плян павярхоўны і нікуды ня варты.

Тое-ж самае можна сьмела сказаць аб пляне ўборачнай кампаніі прысланым з раёну. Раённы плян не ахоплівае шмат важнейшых момантаў. У пляне няма нічога аб спаборніцтве паміж калгасамі, аб падрыхтоўцы тары і памяшканьняў для хаваньня ўраджаю і г. д. і г. д.

Відаць, што людзі сьпяшаліся са складаньнем пляну і складалі так, каб толькі хутчэй адчапіцца.

А. М.

У палоне чужых элемэнтаў

На ст. Бачыха МБВ чыг. даўно ўжо праводзілі актыўную дзейнасьць клясава-чужыя элемэнты, якімі кіраваў былы начальнік станцыі Ванюкі яго прыяцель, загадчык ПТК станцыі—Гушча.

Ванюк—сын былога гарадзкога галавы, Гушча—былы вайсковы чыноўнік.

Карыстаючыся службовым становішчам, яны стварылі навакол сябе «актыў» з падпарадкаваных ім служачых.

У часе правядзеньня калектывізацыі, гэта кампанія актыўна выступала супроць мерапрыемстваў партыі. Гушча, як загадчык поштай са спазьненьнем перадаваў газэты. Гэта ён рабіў з тэй мэтай, каб мясцовыя работнікі не маглі хутка арыентавацца ў падзеях. Тэрміновыя тэлеграмы аб пасеўкампаніі перадаваліся са спазьненьнем.

Ванюк і Гушча не пасароміліся на агульным сходзе ў маі месяцы назваць членаў партыі «бандытамі».

Насьценгазэта станцыі «Гудок» знаходзіцца ў самым мізэрным становішчы, выходзіць нерэгулярна, палохаецца самакрытыкі, бо «начальства» заціскула рот рабкорам. Ванюк у маі месяцы выклікаў у свой кабінэт адказнага рэдактара газэты Шкрэдава і заявіў яму: «Калі будзеш пісаць, выганю з работы».

У часе адсутнасьці старшыні мясцкому і сакратара партячэйкі, Ванюк і Гушча правялі перавыбары рэдкалегіі насьценгазэты, ня гледзячы на тое, што прысутнічала толькі 35 проц. належнага ліку. Яны дабіліся выбараў у рэдкалегію іх прыяцеляў чужых людзей, якія зрэдуцелі ўмкнулі выжыць з газэты ўсё, што пахне самакрытыкай.

Некаторыя партыйцы станцыі Сапаўёў, Каменка і інш. падпалі пад упыльу Ванюка. Мараней чым пайсьці на партсход, яны павінны былі атрымаць дазвол ад «начальства» і потым расказаць начальніку станцыі аб чым гаворылася на партсходзе.

Праадысцыпліна на станцыі была ў запінадзе. Стрэлачнікі прыходзілі п'яными, памощнік начальніка станцыі часта трымаў вагоны на некалькі сутак не разгружанымі, і ніхто на гэта не рэагаваў. Гэта агідная гісторыя цягнулася 4 гады.

Толькі за апошні час, дзякуючы ініцыятыве рабочых, усе агідныя былі выкрыты і злачынцы арыштаваны. Выкрыцьцё гэтага гнязда выклікала вялікую актыўнасьць рабочых. За апошні тыдзень у гарадзкі райком партыі перадазена 21 заява аб прыёме ў партыю.

Уборцы пагражае зрыў

Малатарні і плугі валяюцца на складах

Падрыхтоўка да ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі ў Дубровенскім раёне знаходзіцца ў трывожным і пагражаючым становішчы. З прычыны недапушчальнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі па Дубровеншчыне фактычна сарвана.

Ніхто ў раёне падрыхтоўкай да ўборкі ня кіруе. Райпаляводсаюз, напрыклад, у гэтай рабоце ня прымае непасрэднага ўдзелу. Становішча з уборачнымі машынамі напружанае. У раёне не хапае машын, а на складзе паляводсаюзу ляжаць без патрэбы 2 жнівяркі. Аршанскі акруговы саюз прыслаў раённаму паляводсаюзу 5 трактарных плугоў і 4 складаныя малатарні. Між тым, у раёне няма ніводнага трактара. Хто будзе прыводзіць у рух гэтыя малатарні—невядома.

На 57 акучнікаў і 145 плугоў няма распэнкі, і таму яны не разьмяркоўваюцца сярод арцеляй і індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Правальваецца кантрактацыя пасеваў. У раён пасылаюцца агенты, якія літаральна нічога ня ведаюць, як трэба праводзіць кантрактацыю. Кантрактацыя ідзе, галоўным чынам, на мінэральнае ўгнаеньне, якога... няма. Касьцяной мукі для калгасаў ня хопіць. Такім чынам, сэнс кантрактацыі губляецца. Аднаму калгасу далі некалькі сот пудоў касьцяной мукі, якая ляжыць у калгасе без усялякай карысьці. І гэта ў той час, калі ў раёне не хапае ўгнаеньня.

Некалькі дзён таму назад «Зьвязда» падавала факты абураючага ігнараваньня індывідуальнага сэктару ў Верацейскім сельсавеце, Дубровенскага раёну. У якасьці прыкладаў мы паведамлялі аб калгасе імя XII-годзьдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзе мясцовая ячэйка зусім забылася, што трэба праводзіць работу сярод індывідуальных бядняцка-серадняцкіх мас. Кулакі скарыстоўваюць такое становішча і нацкоўваюць найменш устойлівую частку індывідуальнікаў супроць калгасу.

Гэты прыклад не адзінкавы. У некаторых іншых сельсаветах (Мардашэвіцкі) ёсьць факты ігнараваньня індывідуальнага сэктару. На гэтай глебе ўзьнікаюць канфлікты. Кулацкія элемэнты скарыстоўваюць усё гэта ў сваіх інтарэсах і разгортваюць шалёную агітацыю супроць калгасаў. Кулакі абнаглелі да таго, што развалілі калгас «Перамога». Трэба проста сказаць, што раённыя арганізацыі не даюць у цэлым радзе выпадкаў патрэбнага адпору кулацкаму супраціўленьню.

Раённы выканком нездавальняюча кіруе калгасным будаўніцтвам на Дубровеншчыне. У рэзультаце частка калгасаў Дубровенскага раёну фактычна развальваецца. Трэба бязумоўна, усімі спосабамі выправіць усе гэтыя вялікія прарывы і папярэдзіць правал уборачнай кампаніі ў Дубровенскім раёне.

П. В.М-ў.

„Цішэй едзем, далей будзем...“

— Цішэй едзеш, далей будзеш,—так напэўна разважаюць асьвейскія раённыя работнікі. Прытрымліваючыся гэтага дэвізу, раённыя работнікі зусім ня рыхтуюцца да ўборачнай кампаніі.

Асьвейскія арганізацыі яшчэ да сёнешняга дня не распрацавалі канкрэтных і практычных мерапрыемстваў па правядзеньні ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі. Ні адзін калгас (а іх у Асьвейскім раёне 19), ня мае рабочай праграмы ўборкі ўраджаю і пляну правядзеньня асеньняй сяўбы. Калгасы і індывідуальныя гаспадаркі раёну да ўборкі ўраджаю пакуль што зусім не падрыхтаваны.

Інвэнтар яшчэ не адрамантаваны. Тара і перавозачныя сродкі таксама не падрыхтаваны.

Р—н.

Калгас „Пераможца“ падрыхтаваны

КАЛГАС «ПЕРАМОЖЦА» (БЯРЭЗІНСКІ РАЁН, МЕНШЧЫНА) ЯДНАЕ 7 ГАСПАДАРКІ, З ЯКІХ 15 ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА БЯДНЯЦКІМІ. КАЛГАС МАЕ 1.500 ГЭКТ. ЗЯМЛІ.

ДА ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ «ПЕРАМОЖЦА» РЫХТУЕЦЦА БАЯВЫМ ТЭМПАМ У КАЛГАСЕ СКЛАДЗЕНЫ ПЛЯН, ЯК ПРАДУГЛЕДЖВАЕ ЎСЕ ГАЛІНЫ ЎБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ.

УСЕ ЎБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ І С.-Г ІНВЭНТАР ЦАЛКАМ АДРАМАНТАВАНЫ. СТВОРАНЫ ЎДАРНЫЯ БРЫГАДЫ.

Злачынныя тэмпы

У Старадароскім раёне (Бабруйшчына) уборачная кампанія знаходзіцца пад пагрозай. У раёне ўжо распачата ўборка жыта, ячменю, пшаніцы і іншых культур. Ня гледзячы на гэта уборка сенажаці скончана толькі на 11 проц. Раённы плян уборачнай кампаніі складзены нядбайна. У пляне няма практычных паказальнікаў.

Больш палавіны калгасаў раёну прыступілі да ўборкі ўраджаю бяз пляну. У 14 калгасах адчуваецца вялікі дэфіцыт у рабочай сіле. Між тым, гэтыя калгасы маюць вялікія гаспадаркі са значнай плошчаю пасеваў. Ёсьць рэальная небясьпека, што ўсе 14 калгасаў ня здолеюць справіцца з уборкай ураджаю.

У дапамогу калгасам у раёне арганізаваны камсамольскія і рабочыя брыгады. Аднак, гэтыя брыгады да практычнай работы ня прыступілі. Уборачных машын у раёне не хапае. Для калгасаў патрэбны 5 жнівярак, 1[illegible] конных граблей. Гэтых машын у Старадароскім раёне цяпер няма у тым час, калі ў суседнім Слуцкім раёне ёсьць значны лішак уборачных машын, якія валяюцца без патрэбы.

У калгасах ударніцтва і сацыялістычнае спаборніцтва не разгорнуты. Мясцовыя арганізацыі ў гэтым кірунку нічога ня робяць.

Плян асеньняй пасеўнай кампаніі яшчэ зусім ня складзен.

Брыгада «Зьвязды».

У паход за паперу

ПАШЫРЫМ БАЗУ ПАПЯРОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

Белпапертрэст спасылаецца на аб'ектыўныя ўмовы

Прамфінплян рэальны.---Яшчэ не скарыстаны ўсе мясцовыя рэсурсы папяровых прадпрыемстваў

У Белпапертрэсьце—стаўка на самацёк

19-га ліпеня адбылося пасяджэньне Рэспубліканскага штабу па правядзеньні паходу за паперу.

З інфармацыяй аб выкананьні прамфінпляну на папяровай прамысловасьці выступіл прадстаўнік Белпапертрэсту—Кулеш, Роэнфэльд і старшыня ЦП саюзу паперніка т. Станкевіч.

Дакладчыкі адзначылі, што выкананьне прамфінпляну папяровай прамысловасьці пад пагрозаю недавыкананьня. За 9 месяцаў праграма выканана толькі на 97,9 проц. Прычыны гэтаму зусім простыя. Рабочыя масы не мабілізаваны вакол выкананьня прамфінпляну, бо ён не даведзены да кожнага варштату і паасобнага рабочага.

Класьлістычнае спаборніцтва ня было разгорнута. Некаторыя фабрыкі, як імя Сталіна і «Прафінтэрн» зусім ня ўдзельнічалі ў сацыялістычным спаборніцтве.

Удзел рабочых ва ўдарных брыгадах вельмі нязначны. Усяго 60 проц. рабочых абвясьцілі сябе ўдарнікамі на лепшых прадпрыемствах, а на астатніх фабрыках гэты процант яшчэ ніжэйшы.

З прычыны слабога разгортваньня ўдарніцтва і сацспаборніцтва, тыя фабрыкі («Спартак»), якія ў першым квартале ішлі ў першых радох змагароў за выкананьне прамфінпляну, зараз пачалі ўступаць свае пярэдняе.

На арэне дзейнасьці зьяўляюцца прастоі, вялікая колькасьць браку. Інакш і не магло быць пры такіх адносінах. Адміністрацыя папяровых фабрык («Спартак», «Прафінтэрн») не аддавала дастатковай увагі рацыяналізатарскім прадпрыемствам. Напрыклад, на фабрыцы «Спартак» пастаўлены быў новы дадатковы цыліндр, якога інжынэрна-тэхнічны пэрсанал не праверыў добра, а потым пасьля ўстаноўкі гэты цыліндр пачаў даваць вялікую колькасьць браку.

Некаторыя работнікі Белпапертрэсту апартуністычна адносяцца да ўсіх магчымасьцяў, якія маюцца да выкананьня прамфінпляну. Апусьціўшы рукі яны бязьдзейнічаюць ў зьнішчэньні недахопаў, якія перашкаджаюць у выкананьні прамфінпляну, ссылаючыся на аб'ектыўныя прычыны і матывіруючы тым «што плян усё роўна мы ня выканаем».

Штаб рэзка асудзіў гэтыя шкодныя думкі і бязьдзейнасьць Белпапертрэсту.

На фронце загатовак макулатуры і ўцільсыравіны штаб выявіў, што загатоўцы ня прымалі захадаў да перавыкананьня пляну загатовак, якога паводле афіцыйнай заяўкі спецыялістых магчым было перавыканаць.

Штаб адзначыў незадавальненасьць савецкіх устаноў і прафэсыянальных арганізацый у галіне збору адкідаў, які валяюцца ва ўстановах.

Ва ўсёй правядзімай рабоце—паход за паперу недапушчальна адстае камсамол. ЦК ЛКСМБ ня гледзячы на распаноў з боку штабу аб выпучэньні прадстаўніка ў яго склад, яшчэ да гэтага часу гэтае прапановы ня выканаў.

У сваіх пастановах штаб прапанава усім вышэйстаячым арганізацыям дае належныя дырэктывы на мясцох да забесьпячэньня пасьпяховага правядзеньня агляду сацспаборніцтва за паперу.

Апрача гэтага штаб пастанавіў арганізаваць ударныя брыгады, якія накіраваць на папяровыя прадпрыемствы для дапамогі ў правядзеньні агляду.

У пачатку жніўня, паводле пастановы штабу, будзе склікана Усебеларуская нарада рэдактароў шматтыражак, дырэктароў папяровых фабрык, і старшынь ударных брыгад.

І. Л-іч.

СУПРОЦЬ СПАСЫЛКІ НА АБ'ЕКТЫЎНЫЯ ЎМОВЫ

Асноўныя задачы і мэты кампаніі змаганьня за паперу, заключаюцца галоўным чынам у вышукваньні новых шляхоў для хуткага разьвіцьця папяровай прамысловасьці. Адсюль вынікае, што ўся наша грамадзкасьць павінна сканцэнтраваць сваю ўвагу на змаганьні з усім тым, што тармозіць разьвіцьцё папяровай прамысловасьці.

Усялякае адцягненьне ўвагі ад сапраўднага становішча і пэрспэктыў папяровай прамысловасьці ўводзіць у замяшанньне нашу грамадзкасьць і тым самым накіроўвае у няправільныя рэчышчы ўсю работу па правядзеньні гэтай важнай кампаніі.

Тав. Кофман у сваім артыкуле «Папяровая прамысловасьць БССР і пэрспэктывы яе разьвіцьця», які зьмешчаны ў газэце «Зьвязда», ад 19 ліпеня і ў іншых газэтах, не канцэнтруе ўвагі савецкай грамадзкасьці на тых прычынах, якія сапраўды тармозяць разьвіцьцё папяровай прамысловасьці. Ён спасылаецца на «аб'ектыўныя» ўмовы і супярэчыць сам сабе.

У гэтым артыкуле т. Кофман піша, што вытворчасьць паперы

Менск забясьпечан дровамі

Чаргі ствараюць галавацяпы з МЦРК

Патрабуем тэрміновай ўмяшальнасьці пракуратуры

Ні для кога не сакрэт, што мы цяпер перажываем некаторыя цяжкасьці ў рабочым забесьпячэньні. Гэта становішча асабліва прымушае і патрабуе ад нас плянавай, выразнай і бесперабойнай работы. Усякае малейшае дарэмнае трапаньне нэрваў у спажыўца, стварэньне чаргі там, дзе гэта можна абыйсьці, зьяўляецца проста злачынствам.

Гісторыя з тэй агіднасьцю, якая адбывалася ў Менску з дровамі, зьяўляецца паказальнай і цалкам ляжыць на адказнасьці МЦРК.

Для забесьпячэньня Менску дровамі на ўвесь год патрэбна 280.000 кубамэтр. Згодна пастановы ЭКАНА, ў чацьвёртым квартале павінна быць прывезена ня менш 50 проц. усёй гадовай патрэбнасьці. **У ліпені і ў жніўні ў Менск будзе прывезена ня менш 100.000 кубамэтраў дроў, г. зн. за два месяцы будзе прывезена больш 60 проц. усяе патрэбы мінулага году. Цяпер штодзенна прывозіцца ў Менск 20-30 вагонаў.**

Такім чынам пры правільным размеркаваньні, пры наладжанасьці **ніякіх пераболў у забесьпячэньні дровамі насельніцтва на сёньняшні дзень не павінна і не магло быць.**

Між тым у апошнія тыдзень-два ля дрывянага складу стварыліся вялізарныя чаргі. Часта тыя, што стаялі ў чаргах, атрымлівалі дровы толькі на заўтра. Менскія возчыкі выкарыстоўвалі гэтае становішча і менш, чым за 10-12 руб. ў бліжэйшыя раёны, а ў далёкія і за 20-30 руб. не жадаюць ехаць. Гэта яшчэ больш узмацніла трывожныя настроі спажыўцоў.

Як-жа стварыліся чаргі і чаму ЦРК ня здолеў наладзіць бесперабойнага забесьпячэньня?

Яшчэ ў мінулым годзе пры выдачы дроў стварыліся чаргі таму што адзіны працяглы склад Менцэрабкопу на Бабруйскай вуліцы зусім не прыстасаваны для абслугоўваньня ўсяго гораду. На складзе няма пад'язных ліній чыгункі і дровы прыходзіцца перавозіць з чыгункі на склад, што значна тармозіць работу.

Да гэтага трэба дадаць, што некалькі тыдняў таму назад начальнік чыгункі забараніў падачу вагонаў з дровамі на Бабруйскую вул., матывуючы, што лінія патрэбна для выгрузкі будаўнічых матар'ялаў для будаўніцтва Дому Ураду.

У выніку вагоны пачалі разгружацца за горадам, у Курасоўшчыне. Насельніцтва, прыходзячы за дровамі, атрымлівала адказ: «дровы выдаюцца ў Курасоўшчыне і калі хочаце, можаце іх там атрымаць». Тыя, хто ня меў чым паліць, пачалі брацьдровы ў Курасоўшчыне, плацячы возчыкам шалёныя грошы за перавозку. Толькі калі гэтай справай занялася РСІ, гэта «разумная» настанова была скасавана, і дровы цяпер прывозяць ізноў на склад на Бабруйскай вул.

Гэты часовы перабой скарыстоўвалі ворагі савецкай улады і абываталі. Распаўсюджваліся гаворкі, што дровы на складзе выдаюцца толькі часова і што ў далейшым можна будзе атрымаць дровы толькі за горадам, у Курасоўшчыне. Адразу пачалі стварацца чаргі.

30 вагонаў, якія атрымліваюцца кожны дзень, ужо не хапае. Усякі хоча цяпер назапасіць дроў на ўсю зіму. Склад, які летась у чэрвені прадаваў дроў на 6-10 тысяч, цяпер прадаў больш як на 100.000 руб. Зразумела, што ўсё патрэбнасьць Менску ў дровах на працягу аднаго месяцу ня можа быць задаволена. Менцэрабкоп ніякіх мер для ўрэгулываньня водпуску дроў ня прымаў. Толькі сёньня, МЦРК знайшоў выхад. У бліжэйшыя дні дровы будуць выдавацца на калектывах. Гэта значыць, у адзін дзень будзе атрымліваць калектыў заводу «Бальшавік», у другі дзень—другі калектыў і г. д.

Такім чынам непарадкі ў выдачы дроў будуць зьнішчаны.

Перад Цэрабкопам стаіць неадкладная задача зараз-жа прыступіць да пабудовы новага складу, праект якога ўжо ўзгоднены ва ўсіх інстанцыях. Зараз-жа трэба таксама зьменшыць апетыты возчыкаў, дзеля чаго ЦРК павінен ужыць усе меры для стварэньня свайго транспарту, які-б абслугоўваў пайшчыкаў.

Такія адносіны з боку ЦРК зусім недапушчальны.

Мы патрабуем неадкладнай умяшальнасьці пракуратуры для выяўленьня канкрэтных вінаватых для прыцягненьня іх да суровай адказнасьці.

А—с.

Ліпнёўскі плян улову рыбы зрываецца

За дзесяціднёўку вылаўлена толькі 760 цэнтн.

За першую дзесяціднёўку ліпеня ўлоў рыбы катастрафічна зьнізіўся — замест 1.046 цэнтнэраў за час з 20 чэрвеня па 1 ліпеня, за першую дэкаду ліпеня вылаўлена толькі 760 цэнтнэраў. Па Полацкай акрузе ловля зьнізілася з 479 да 230 цэнт., па Гомельскай — з 101 да 47.

Якія прычыны зьніжэньня ловлі рыбы?

1) Уборка ўраджаю, зразумела, аказала вельмі адмоўны ўплыў на ход ловлі рыбы. Мясцовыя арганізацыі сампрамкаапэрацыі і работнікі Белрыбы не падрыхтаваліся да ўборачнай кампаніі, не дагаварыліся загадзя з калгасамі і мясцовымі савецкімі органамі аб тым, каб рыбакі-калгаснікі ня былі адарваны ад рыбнай ловлі, а заменены на ўборцы іншымі.

2) Органы НКФ на мясцох зусім ня лічацца з дырэктывамі аб прадастаўленьні максымальных льгот рыбакам-членам арцелі. Да абкладаньня рыбакоў падышлі трафарэтна — абкладаецца 30 проц. ліку прыбытку без належнай клясавай дыфэрэнцыяцыі.

3) Сампрамкаапэрацыя нічога не зрабіла для таго, каб даць рыбакам патрэбныя сецяматар'ялы. У Аршанскай і Мазырскай акругах з-за адсутнасьці сецяй у некаторых арцелях ловля зусім спынілася.

4) Дагэтуль значная плошча вадаёмаў, якая-б дала шмат рыбы, не скарыстоўваецца з-за засьмечанасьці, а працаўнікі Белрыбы на мясцох нічога ня робяць, каб ачысьціць вадаёмы.

5) Зусім адсутнічае сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў рыбалоўных арцелях. Гэта не дае магчымасьці ўцягнуць шырокія колы каапэраваных рыбакоў у барацьбу за выкананьне і перавыкананьне плянаў улову.

Пагражаючае становішча з уловам патрабуе пільнай увагі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Пляны ловлі павінны быць выкананы! Рабочы-спажывец павінен атрымаць рыбу! Пакуль ня позна, трэба прыняць самыя тэрміновыя меры, каб дабіцца пералому ў выкананьні плянаў улову.

РЫБАК.

Прыём на вячэрні рабфак

У гэтым годзе адбудзецца прыём на ўсе 4 курсы агульнага і яўрэйскага аддзяленьняў Менскага вячэрняга рабфаку.

На вячэрні рабфак прымаюцца рабочыя з ня менш як 3-гадовым вытворчым стажам, а таксама і дзеці рабочых, бацькі якіх маюць 5-гадовы вытворчы стаж.

Асобы, якія камандыруюцца на вячэрні рабфак вызначаюцца праўленьнем саюзаў праз фабзаўмясцкомы.

Скончыўшыя сямігодкі, а таксама першы і другі год школ узвышанага тыпу прымаюцца пасьля іспытаў на адпаведны старшы курс рабфаку.

Студэнты I, II і III курсаў карыстаюцца ільготай — працуюць на прадпрыемстве 6 гадзін, студэнты апошняга курсу з 1-га кастрычніка будуць аслабанены ад работы на вытворчасьці і забясьпечаны стыпэндыяй.

Агульным інтэрнатам вячэрні рабфак не забясьпечвае.

Дэлегацыя кітайскіх камуністых—у ЦВК БССР

20 ліпеня г.г. ЦВК БССР наведала дэлегацыя кітайскіх камуністых у ліку 25 асоб, якія прыехалі ў БССР для азнаямленьня з нашым сацыялістычным будаўніцтвам. Суправаджае дэлегацыю былы член ЦВК БССР тав. Ахманаў, які цяпер працуе ў Маскве.

Дэлегацыю ад імя ЦВК БССР прыняў намесьнік старшыні ЦВК тав. А. І. ХАЦКЕВІЧ.

Па просьбе дэлегацыі тав. Хацкевіч азнаёміў дэлегатаў з агульным становішчам Савецкай Беларусі. Ахарактарызаваўшы ў кароткіх рысах сацыяльны і нацыянальны прыгон, пад якім знаходзіліся рабочыя і працоўнае сялянства ў дарэвалюцыйны час і ў часе нямецкай і польскай акупацый БССР, зазначыўшы пра разбурэньне, якое панінулі акупанты, — тав. Хацкевіч азнаёміў у гутарцы дэлегатаў з сучасным становішчам БССР, з тымі дасягненьнямі, якія мы маем ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва і якія намі дасягнуты дзякуючы дыктатуры пралетарыяту і кіраўніцтву камуністычнай партыі.

Адзначыў таксама тав. Хацкевіч пагрозу ваеннага нападу на СССР з боку сусьветнай буржуазіі, небясьпеку для БССР, якая знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам і гатоўнасьць Чырвонай арміі, рабочых і працоўнага сялянства да абароны пад кіраўніцтвам кампартыі, сваіх межаў і заваёў Кастрычніка.

Адзін з дэлегатаў перакладаў прамову тав. Хацкевіча на кітайскую мову.

Дэлегаты ўважліва слухалі гутарку тав. Хацкевіча і старанна запісвалі тыя лічбы, якімі тав. Хацкевіч характарызаваў нашыя дасягненьні ў сацыялістычным будаўніцтве.

Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва БССР, упаданьні ў нашую прамысловасьць, прадукцыя яе, колькасьць сродкаў, якія адпускаюцца па бюджэту на асьвету, колькасны склад нашых вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, — усё гэта дэлегаты старанна запісвалі у свае блёк-ноты.

Пасьля гутаркі з тав. Хацкевічам, старшыня дэлегацыі тав. КРУГ выступіў ад імя дэлегацыі з прывітальнай прамовай.

«Мы—заявіў тав. Круг—прыехалі ў СССР вучыцца ў вас будаваць сацыялізм, пераняць у вас вопыт сацыялістычнага будаўніцтва і перанесьці гэты вопыт у Кітай. Нацыянальнае пытаньне, аграрная праблема — усё гэта пытаньні, якія вы ўжо вырашылі, чакаюць у нас яшчэ свайго вырашэньня».

Далей тав. Круг зазначыў, што дэлегацыя, наведаўшы Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт і іншыя ўстановы, а таксама вывучаючы нашае будаўніцтва наогул, пераканалася ў тым, што БССР мае надзвычайна вялізныя дасягненьні ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва.

«Азнаямленьне з сацыялістычным будаўніцтвам у БССР—кажа тав. Круг—дало нам шмат ведаў, якія мы скарыстаем у рэвалюцыйнай рабоце ў Кітаі».

Тав. Хацкевіч адказаў на прывітаньне дэлегацыі кароткай прамовай, у якой падкрэсьліў брацтва працоўных БССР, як часткі Саюзу ССР — з рабочымі і рэвалюцыйным сялянствам Кітаю, якія цяпер змагаюцца за свае сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне з кіпцюроў сусьветнага драпежнага капіталу, і пажадаў дэлегацыі хутчэй убачыць Кітай вызваленым, у агульнай сям'і працоўных і іншых вызваленых народаў.

У часе гутаркі дэлегацыі з т. Хацкевічам паступіла тэлеграма з Віцебск. акр., у якой калгаснікі кітайскага калгасу запрашаюць да сябе дэлегацыю. Дэлегаты з Менску паедуць у Віцебшчыну і наведаюць гэты калгасы.

Тыраж 2-й аўталётарэі

16-17 ліпеня г.г. у Ленінградзе адбыўся тыраж 1-га разраду 2-й усесаюзнай аўта-лётарэі Аўтадору.

Пры адчыненьні тыражу прысутнічала некалькі тысяч ленінградзкіх рабочых і служачых. У прывітальных прамовах прадстаўнікі Ленінградзкіх абласных, партыйных, прафесыянальных, савецкіх і іншых арганізацый адзначылі тую вялізарную ролю, якую ў цяперашні час адыгрывае Аўтадор у справе мэханізацыі нашага транспарту, аўтамабілізацыі краіны, трактарызацыі сельскае гаспадаркі і паляпшэньня стану нашых дарог.

Усяго было разыграна 1.332 выйгрышы на агульную суму 60.575 руб. Тут-жа многімі з прысутных па тыражы былі прад'яўлены лётарэйныя білеты, на якія палі выйгрышы — вялёсыпэды. Гэтыя выйгрышы былі выданы ім на месцы.

На галоўныя выйгрышы палі наступныя №№ білетаў і сэрый:

Глісэр, коштам у 2.500 руб., білет № 042, сэрыя 05842;

Аўтамабілі «Форд», коштам па 2.000 р.: № 055, сэрыя 03279, № 063, сэрыя 03980, № 081 сэрыі 03442, № 071 сэрыі 05833, № 006 сэрыі 04990 ,№ 082 сэрыі 03954, № 041 сэрыі 06323;

Матацыклі, коштам у 800 руб.: № 035 сэрыі 06147, № 034 сэрыі 00646, № 047 сэрыі 02513, № 070 сэрыі 00533, № 056 сэрыі 01558, № 027 сэрыі 02817, № 050 сэрыі № 03103;

Маторныя байдаркі, коштам у 300 руб.: № 028 сэрыі 04735, № 45 сэрыі 06003; яшчэ 200 вэлёсыпэдаў і рад выйгрышаў.

Тыраж 2-разраду адбудзецца ў Харкаве ў лістападзе г.г.

Н. ГОРДЗІН.

Канцэрт ударнай брыгады Белрадыёцэнтру

Сёньня, 21 ліпеня, у летнім тэатры саду «Прафінтэрн» адбудзецца справаздачны канцэрт ударнай брыгады Белрадыёцэнтру і Галоўмастацтва БССР для рабочых г. Менску.

Брыгада толькі што вярнулася з падарожжа па Беларусі; яна абслугоўвала канцэртамі пашы буйнейшыя прадпрыемствы, чырвонаармейскія лягеры і калгасы.

Рэпэртуар брыгады складаецца з беларускіх народных і рэвалюцыйных песьняў. У сваіх канцэртах брыгада адлюстроўвае жыцьцё працоўных у часы нырэпу і сучаснае сацыялістычнае будаўніцтва.

Брыгада атрымала шмат водзываў і падзяк ад рабочых Асінбуду, чыгунак, фабрык і заводаў, калгасьнікаў.

У склад яе ўваходзяць артыстыя Белрадыёцэнтру пад кіраўніцтвам муз. кіраўніка радыёцэнтру т. Любана.

Юр.

Аршанскі Камітэт Чырвонага Крыжу ня справіўся са сваімі задачамі

Прэзыдыум ЦК т-ва Чырвонага Крыжу абсьледваў работу Аршанскага акруговага камітэту т-ва. Прэзыдыум прызнаў работу неадавальняючай. У пяці раёнах акругі няма арганізацый Чырвонага Крыжу, акруговы камітэт зусім не кіраваў работай т-ва на мясцох. Аршанская санітарная дружына была распушчана, у той час, як па акрузе можна было арганізаваць некалькі санітарных дружын—у Дуброўне, у Сталінбудзе, у Горках, а ў самім горадзе Воршы павінны былі прапавацъ 2 санітарныя дружыны.

Прэзыдыум ЦК Чырвонага Крыжу настанавіў абнавіць кіруючы склад прэзыдыуму Аршанскага акруговага камітэту і зьняць з работы начальніка санітарнай дружыны тав. Лабкоўскага.

Р.

З лістоў рабселькораў

ПААБІВАЛІ ПАРОГІ, А ВЫНІКАЎ МАЛА

На курсах па падрыхтоўцы каапэрацыйных і гаспадарчых работнікаў пры **Белкаапсаюзе** яшчэ да гэтага часу ня створаны нармальныя ўмовы для работы.

Белкаапсаюз ужо паабіваў парогі ва ўсіх арганізацыях, ад якіх толькі залежыць дапамога курсам, а вынікаў мала. **Гарсавет** нядбайна адносіцца да хадайніцтва адміністрацыі курсаў аб прадстаўленьні ім памяшканьня для інтэрнату. І толькі ў апошні час прадастаўлен ім інтэрнат, які трэба рамантаваць, а курсанты тым часам валяюцца ў заежджых дамох, па 4-5 чалавек у маленькім пакоіку.

Таксама адсутнічае сталае месца для заняткаў. Курсантам прыходзіцца ў дзень мяняць 2—3 пакоі для заняткаў.

Пры гэтакіх умовах надалей курсы ня могуць так застацца.

Гарсавет павінен, як мага хутчэй здаволіць хадайніцтва **Белкаапсаюзу.**

Рабочы.

ГАЛАВАЦЯПСКІЯ АДНОСІНЫ ДА ТОРФАРАСПРАЦОВАК

Вярбоўшчык торфараспрацовак **Асінбуду**, будучы ў **Магілеве** сустрэўся з галавацяпскімі адносінамі да яго заявак з боку біржы працы і прафесыянальных арганізацый. Справа пачалася з таго, што загадчык біржы т. **Пракаповіч** адмовіў выдаць дазвол вярбоўшчыку для вярбоўкі рабочых на торфараспрацоўкі **Асінбуду**, матывуючы гэта тым, што ў **Магілеўскай** акрузе адсутнічае рабочая сіла. У сапраўднасьці, рабочыя маюцца ў **Магілеўскай акрузе**, інакш-бы біржа працы не дала дазволу на вярбоўку 600 рабочых для **Архангельску.**

Шесьць дзён пратупаў вярбоўшчык па **Магілеўскіх** арганізацыях і толькі пасьля прананоны **АК КП(б)Б** быў выладзен дазвол.

Мы пытаемся для чаго была патрэбна такая цяганіна на працягу шасьці дзён?

Трапашка С.

РАБОЧАЕ ВЫНАХОДНІЦТВА МАРЫНУЕЦЦА

Рабочы саўгасу **Смалявічы** т. **Фурман** зрабіў мадэль бульбяного камбайна, які змог бы, пры ўдасканаленьні, [illegible] капаць бульбу, ачышчаць ад пяску і сыпаць у скрынкі ці ў мяхі.

21 чэрвеня т. **Фурман** з мадэльлю зьявіўся ў **Белсельтрэст**, адтуль яго накіравалі ў **Наркамзем.** Работнік **Наркамзему** патрабаваў ад т. **Фурмана** дакладнага тэхнічнага вылічэньня карысьнасьці гэтае машыны, у той час, як работы —каваль ледзь можа расьпісацца.

Зараз гэтае вынаходніцтва валяецца ў **Менскай** бульбяной вопытнай станцыі бяз усякіх вынікаў.

ЦЯГНІК СЫСТЭМАТЫЧНА СПАЗЬНЯЕЦЦА

Дачны цягнік ст. **Беларусь—Менск** павінен прыбываць у **Менск** у 8 гадз. 30 мін., але гэтага ніколі ня бывае. Ён заўсёды позьніцца на 20-30 мін.

Рабочыя, якія едуць на гэтым цягніку, заўсёды позьняцца на работу.

Чыгунка МВБ павінна зьвяшчыць спазьненьне цягніка.

Г.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Кастрыч. РК КП(б)Б. А 7 г. веч. у памяш. РК адбудзецца пасяджэньне партройкі, на якім будуць разглядацца справы наступных т. т.: Юрыса—(яч. зав. «Энэргія»), Памаранскага—(дэпо), Каплана С. А. і Дашкевіча—(яч. мэдфаку БДУ), Марозава П. Я.—(яч. пэдфаку БДУ), Нотава—(яч. грузчыкаў), Паўлукіна—(яч. ДПУ). Памянёныя т.т. і сакратары ячэек павінны зьявіцца на пасяджэньне без спазьненьня.

— **Кастрычніці** РК КП(б)Б а 6 г. веч. у клюбе Леніна (ст. Менск-пас.) склікае **нараду гаспадарча-вытворчых сэкстароў ячэек і гаспадарнікаў-партыйцаў.** У парадку дня: **вынікі сацспаборніцтва і ўдарніцтва па раёне.** Прадстаўнікі памянёных сэктароў і гаспадарнікі-партыйцы павінны зьявіцца без спазьненьня.

— У памяш. **Кастрычніцкага** РК КП(б)Б а 6 г. веч. адбудзецца **нарада ўпоўнаважаных па выпісцы** газ. «Зьвязда» і «Правда». Упоўнаважаныя на нараду павінны зьявіцца з наступнымі весткамі: колькі выпісваецца «Зьвязды» і «Правды» партыйцамі і б-п., колькі выпісваецца часопісі «Большавік» і газ «Рабочий».

ПАСЬЛЯЗАЎТРА

Фрунз. Райсавет Асоавіяхіму. А 7 г. веч. у памяш. РК адбудзецца нарада ваенорга ў партыйных і камсамольскіх ячэек з прадстаўнікамі культкамісій. У парадку дня: аб правядзеньні міжнароднага Чырвонага дня. Яўка абавязкова.

Дом Асьветы. 23 ліпеня адбудзецца экскурсія тэхн. прапаўнікоў членаў саюзу працасьветы г. Менску ў лягеры. Збор а 7 гадз. раніцы ў Доме Асьветы.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара
А. МІТЛІН.

ЦП саюзаў гарбароў і саўгандальслужачых склікаюць 22 ліпеня а 7 гадз. веч. у клюбе саўгандальслужачых **КАНФЭРЭНЦЫЮ ЎДАРНІКАЎ РАБОЧЫХ** гарбарні «Бальшавік», абутковай ф-кі, Гандальбуду і супрацоўнікаў абутковых крам МЦРК, па пытаньні аб якасьці вырабу скур, тавараў.

Акрамя ўдарнікаў гарбарні, «Бальшавік», абутковай ф-кі, Гандальбуду і ўсіх супрацоўнікаў абутковых крам МЦРК, якія павінны абавязкова зьявіцца, на канфэрэнцыю, запрашаюцца прадстаўнікі: ВКО Бел., НК РСІ, Белскуртрэсту, Наркамтанду, праўленьня МЦРК, БКС, Белсампрамсаюзу, прадстаўнікі друку і рабочыя-спажыўцы.

Працяг канфэрэнцыі-нарады аб выніках агляду грамадзкага харчаваньня адбудзецца сёньня а 6-й гадзіне увечары ў залі пасяджэньня ЦСПСБ.

Прысутнасьць аглядавых брыгад абавязкова.

Запрашаюцца рабочыя і служачыя.

Рэдакцыя газ. «Зьвязда» 22-га ліпеня склікае нараду па пытаньні:

аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году

Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі „Зьвязда"

(Савецкая, 63, 3-ці паверх), а 7 гадз. веч.

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі: Наркамасьветы, Культадзелу ЦСПСБ, ЦБ пралетсэту, Наркамзему, ВСНГ, АК КП(б)Б, АК ЛКСМБ, рэктары БДУ, ВТНУ, Камвуз, дэканы факультэтаў, заг. тахнікумаў і рабфакаў, Калгасаюзу, Белкаапсаюзу, Белдзяржбуду, прадстаўнікі зав. «Энэргія» і «Бальшавік».

Інтэрнацыянальны вечар МОПР'у

Аўторак, 22 ліпеня

Клюб **Акрывакавому** (Пляц Волі)

Менскі акруговы камітэт МОПР'у

праводзіць

ВЯЛІКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР

прысьвечаны **прыезду групы кітайскіх рэвалюцыянэраў.**

На вечары выступяць прадстаўнікі кітайскай кампартыі і камсамолу.

Білеты на інтэрнацыянальны вечар можна атрымаць у ячэйках і райкомах МОПР'у.

ПАЧАТАК роўна а 7 гадз. веч.

Мен. АК МОПР'у.

Летні тэатр саду „Прафінтэрн"

22-га ліпеня — 23-га ліпеня

ПАПУЛЯРНЫЯ **КАНЦЭРТЫ**

Сымфанічнага аркестру Белрадыёцэнтру

пад кіраўніцтвам дырыжэра М. В. МІХАЙЛАВА

з удзелам салістых

ТУХ (скрыпка)

1-ы канцэрт
1. НІКОЛІ—увэрт. Віндзорскія Кумушкі
2. ЧАЙКОВСКІ—Вальс з балету «Сьпячая красавіца»
3. ПУПІ—Канёк-гарбунок
4. ЭРНФЭЛЬД—Калыханні
5. ПАНРАЎНІК—Фанданго
6. МАСЭНЭ—увэрт. «Фэдра»
7. ПАНРАЎНІК—інтэрмэцо «Дуброўскі»
8. МЭНДЭЛЬСОН—скэрцо «Сон у летнюю ночь»
9. ТЭЛОЦ—сэрэнада
10. ПОНКІЭЛІ—«Джыаконда»

КУХАРАУ (бас-барытон)

2-гі канцэрт
1. РАСІНІ—увэрт. «Сэвільскі цырульнік»
2. ГЛІНКА—вальс «Фантазія»
3. ЭЙЛЕНБЭРГ—„Лясны канцэрт"
4. ЭЙЛЕНБЭРГ—„Цыгане-музыканты"
5. РУБІНШТЭЙН—руск. пляскі і трэпак
6. РАСІНІ—увэрт. «Вільгэльм Тэль»
7. ЧАЙКОВСКІ—«Андантэ кантабіле»
8. Соло на коізафоне
9. БОКЕРЫНІ—мэкуэт
10. ЛУЙДЖЫНІ—Эгіпэцкі балет.

І цэлы рад сольных нумароў.

Выкананьне ідзе з тлумачэньнем музкіраўніка БРЦ і Любина

—— БІЛЕТЫ ПРАДАЮЦЦА Ў РАБОЧАЙ КАСЕ ——

Пачатак роўна а 9 гадз.

Адміністрацыя тэатру

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"

З панядзелка, 21 ліпеня

— заменены фільм —

ЧАЛАВЕК АГНЮ

У гал. ролях: ОЛЬГА ЧЭХАВА, ХЭЛЬГА ТОМАС

Пачатак 1-га сэансу а 7 г.

Каса адкрыта з 5 г.

КІНО-СПД

З панядзелка, 21 ліпеня

лепшая камэдыя сэзону

ЛЯЛЬКА З МІЛЬЕНАМІ

У галоўных ролях:

Ігар Ільлінскі, Уладзімер Фогель, Ада Войцік, Галіна Краўчанка.

Пачатак 1-га сэансу а 10 гадз.

Каса адкрыта з 6 г. 30 м.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН"

СЁНЬНЯ, 21 ліпеня культсэктар ЦСПСБ і Белрадыёцэнтр

—— АРГАНІЗУЮЦЬ ——

справаздачны КАНЦЭРТ-ВЕЧАР

для рабочых г. Менску **ударнай брыгады Белрадыёцэнтру,** якая вярнулася з паездкі па Беларусі.

Тэма канцэрт-вечару: **беларускія сьпевы да і пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

Білеты распаўсюджаны па ФЗМК.

Пачатак а 8 г. 30 м.

Макаронная фабрыцы імя Леніна ў г. **Нова-Барысаве**

патрабуюцца на сталую працу 1) інжынэр-мэханік або тэхнік-мэханік, 2) цяплотэхнік.

—— АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ ——

ЖАКТ № 15. 22 ліпеня, а 7 г. веч. у летняй сталоўцы МЦРК (рог Старожоўскай і Стара-Віленскай)

адбудзецца

агульны сход пайшчыкаў і жыхароў **ЖАКТ'у № 15.**

У парадку дня: 1) справаздача правяркому, 2) перавыбары праўленьня.

Праўленьне.

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА"

Ад панядзелка, 21-га ліпеня

з прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень

ДАЧКА ГІЛЯНА

Драма ў 8 частках. Паводле раману Ю. Слёзкіна „БРОНЗОВАЯ ЛУНА"

Зьвыш праграмы:

Апошняе дасягненьне тэхнікі жывога кінематографа

ЦУДОУНЫЯ ЦЕНІ

з дадатнам новых нумароў. Дзеля ўспрымацьця эфэкту кожны глядач атрымоўвае спэцыяльныя акуляры ў касе кіно (па сабекошту) 7 к. за штуку.

Пачатак сэансаў: 1-га—7 гадз., 2-га—9 гадз., 3-га—10 гадз. 30 хв.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"

Сёньня і штодня — з 21 ліпеня

— нямецкі фільм —

ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ

(крывавы прысяга)

Рэжысэр—Янові

У галовн. рол.: Аліса Робэрт. Міль Мандэро. Франц Дэрэдэр

Пачатак 1-га сэансу а 7 г. 30 м.

Каса адкрыта з 5 г. 30 м.

ПРАПАЎ САБАКА

карычневай масьці з белымі плямамі, пароды «Пойтэр», клічка БАЯН. Просьба наведаміць па адрасе: Савецкая, 87|19, кв. 10, Харытонавай (ва дварэ кіно «Пралетары») за ўзнагароду. За ўтайку буду прасьледваць па закону

МЯНЯЮ 2 пакоі ў Магілеве ў цэнтры на 1 або 2 пакоі ў Менску.

Зварачацца па адрасе: Менск, Маскоўская, 28, кв. 1, Аверскі.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК

у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,

атрымлівайце газ. **„ЗЬВЯЗДА"**

па месцы знаходжаньня у водпуску,

паведамі́ўшы ў аддзел падпісі газ. «ЗЬВЯЗДА»

ВАШ НОВЫ АДРАС.

Газэта будзе дасылацца на новым адрасе

без асобнай аплаты.

ЛЯЧЭБНІЦА — МЕНСКАГА КАМІТЭТУ ГАРАДЗКОГА УЗЯЕМДАП МОГІ

Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў, тэл.

АДКРЫТА ад 9 гадз. рэн. да 9 г. веч.

Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцям:

па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.

Электра-сьвета-лячэньне і нарэшце адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.

Рэнтген (вымкі, прасьвечаньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. 30 м. да 9 г. увеч.

Прыём хіміка-бактэрыялягічных аналізаў. Аптэка.

ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзенна

Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.

Урачэбная дапамога на даму па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 гадз. раніцы да 2 гадз. дня.

Дэжурныя дактароў з 2 гадз. дня да 9 гадз. увеч.

Начное дэжурства дактароў ад 9 гадз. увеч. да 7 гадз. раніцы.

Прыём хворых па лекавых кніжках камітэт

Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыраваную плату.

Кіно „СПАРТАК"

3 панядзелка, 21 ліпеня

АМЭРЫКАНСКІ БАЯВІК

ГІШПАНСКАЯ ТАНЦОРКА

гістарычны кіно-фільм у 8 част.

у галоўнай ролі ПОЛІ НЭГРЫ

Пачатак сэансаў:

1-га СЭАНСУ—а 7 гадз.
2-га СЭАНСУ—а 9 гадз.
3-га СЭАНСУ—а 10 гадз. 45 м.

КАСА—ад 6 гадз.

Прыём заяў у Барысаўскі Індустрыяльны Тэхнікум, у Барысаўскую Лесаэксплёатац. школу (на базе 7-годкі), Прафшколы будаўнікоў і мэталістых (на базе 4-годкі), у 9-ю групу пры школе № 8, у 8-я групы пры школах №№ 1, 8 (на Беларускай мове) і № 2 (на яўрэйскай мове) у гор. Барысаве,

ПРАЦЯГНУТ да 10 жніўня г. г.

Заявы ў Індустрыяльны Тэхнікум падаюцца на імя прыймовай камісіі тэхнікуму ў Барысаўскі РВК, а ў астатнія ўстановы—на імя загадчыкаў гэтых устаноў.

Інспэктар Нарасьветы Барысаўскага раёну РАМАНОВІЧ.

Гомельскі тэхнікум шляхоў зносін

абвешчае аб прыёме ў 1930 31 г.:

1. Прыём у тэхнікум будзе праводзіцца на эксплёатацыйнае і цягава-эксплёатацыйнае аддзяленьні.

2. Паступаючыя падаюць дакументы: а) анкету, засьведчаную належнымі арганізацыямі; б) пасьведчаньне аб стажы работы; в) аб узросьце; г) аб адносінах да вайсковай павінасьці; д) аб адукацыі; е) аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў; ж) што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых праў. Для асоб, якія маюць сувязь з сельскай гаспадаркай, неабходна акрамя паказаных дакумэнтаў прадставіць копію акладнога ліста с.-г. падатку за 1929-30 год, засьведчаную РВК або ватарыяльнай канторай; з) дзве фатаграфічныя карткі.

У тэхнікум прымаюцца асобы па ўзросту не маладзей 16 год і ня больш 21 году, а рабочыя з вытворчасьці ня больш 30 год.

Заявы прымаюцца ў канцылярыі тэхнікуму (Гомель, Квапэрашыная № 68) штодзенна з 9-ці гадз. да 16 гадз., а з іншага гораду могуць перасылаць поштай з прыкладаньнем марак на 20 капеек.

У тэхнікум прымаюцца: рабочыя, батракі, беднякі, калгаснікі і іх дзеці, а таксама і ўсе іншыя асобы, згодна правіл прыёму ў тэхнікум і ВНУ, апублікаваных Наркамасьветы

На мэдагляд зьявіцца 14 жніўня а 10 гадз. раніцы.

Скончыўшыя 7-годку ў 1929-30 годзе ад іспытаў вызваляюцца.

Стыпэндыяй і інтэрнатам забясьпечваюцца ў агульным парадку.

ТЭХНІКУМ

Для здачы:

АБВЕСТКІ

ў газэту

„ЗЬВЯЗДА"

звонце па тэл.

7-81

ЗАВОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ

Прыём слухачоў праводзіцца [illegible] год.

Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.

ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць на адрасе: Менск, пошта скрынка 44, Заочным курсам.

На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.